Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт мастацкай культуры
Кафедра рэжысуры

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
рэжысуры
_________ Н.В. Петухова
«18» 04 2026 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
мастацкай культуры
_________А.В. Пагоцкая
«18» 04 2026 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ГІСТОРЫЯ СВЯТ

для спецыяльнасці
6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят

СКЛАДАЛЬНІК:

А.В. Катовіч, дацэнт кафедры рэжысуры, кандыдат культуралогіі, дацэнт

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета факультэта мастацкай культуры
17.04.2026 пратакол № 8

2026

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*А.В. Катовіч*, дацэнт кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Т.Ф. Сухоцкая,* дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт.

*А.І. Цяпкова,* старшы навуковы супрацоўнік аддзела экалогіі традыцыйнай культуры ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі», кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай рэжысуры* ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 17.03.2026);
*саветам факультэта* ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 от 17.04. 2026).

**ЗМЕСТ**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА…………………………………… | 4 |
| 2 | ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЕЛ (канспект лекцый)…………………… | 7 |
| 2.1 | Раздзел I. Гісторыя фарміравання беларускай святочнай культуры: палілог каляндарных сістэм | 9 |
| 2.2 | Раздзел II. Традыцыйныя рытуалы і святы ў сусветных культурах | 17 |
| 2.3 | Раздзел III. Гісторыя фарміравання беларускай святочнай культуры (дыялог народнай і хрысціянскай традыцый) | 28 |
| 2.4 | Раздзел IV. Святочная культура: традыцыі і навацыі | 50 |
| 3 | ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА | 59 |
| 4 | ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………… | 63 |
| 4.1 | Тэматыка да семінарскіх заняткаў……….. | 65 |
| 5 | РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ……………………………… | 66 |
| 5.1 | Пытанні да экзамену…………………………………………… | 66 |
| 5.2 | Заданні для самастойнай работы студэнтаў, якая кантралюецца | 68 |
| 6 | ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………… | 69 |
| 6.1 | Спіс асноўнай і дадатковай літаратуры | 69 |
| 6.2 | Вучэбная праграма | 74 |

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя свят» – адна са спецыяльных дысцыплін модуля «Святочная культура Беларусі», выкладанне якой прадугледжана пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне сучаснай святочнай культуры.

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя свят» з’яўляецца базавай кампанентай у вывучэнні міфалагічных вытокаў рытуальна-абрадавай спадчыны і фарміраванні каляндарных сістэм розных народаў свету. Дысцыпліна прадугледжвае вывучэнне генезісу, структуры, сацыякультурных функцый міфа і рытуалу, месца фундаментальных катэгорый у фарміраванні этнакультурных карцін свету. Разгляд міфалагічных традыцый скіраваны на тыпалогію сістэм вярхоўных багоў і ніжэйшай дэманалогіі, іх цесную ўзаемасувязь з комплексамі каляндарных абрадавых практык. Важнай складовай курса з’яўляецца разгляд беларускай міфарытуальнай сістэмы ў кантэксце агульнасусветнай міфалагічнай традыцыі.

Змест дысцыпліны пабудаваны ў логіцы непасрэднай сувязі з вывучэннем такіх спецыяльных дысцыплін, як «Сучасная святочная культура Беларусі», «Тэхналогія стварэння свят», «Мастацка-дэкаратыўнае рашэнне свят», «Рэжысура фальклорных прадстаўленняў», «Рэжысура дзяржаўных спецыяльных мерапрыемстваў», «Рэжысура масавых відовішчаў і святаў на адкрытых пляцоўках» і інш. Выкладанне дысцыпліны ва ўзаемасувязі з іншымі дазваляе ў поўнай меры сфарміраваць у студэнтаў глыбокія веды і практычныя навыкі, неабходныя для пошуку шляхоў вырашэння творчых праблем увасаблення святочных дзеянняў на сучасным этапе.

*Мэта* вучэбна-метадычнага комплекса па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя свят»: раскрыць гісторыка-культурныя, міфасемантычныя і тыпалагічныя аспекты вывучэння рытуальна-абрадавых практык еўразійскіх народаў; на падставе структурна-семантычнага і зместава-сімвалічнага аналізу сфарміраваць у студэнтаў неабходныя веды і кампетэнцыі ў галіне традыцыйных рытуальна-абрадавых практык, якія павінны спрыяць развіццю сучаснай святочнай культуры народа.

*Задачы* вучэбна-метадычнага комплекса па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя свят»*:*

– раскрыць асноўныя сістэмы паняццяў святочнай культуры, тыпалогію святочна-абрадавых комплексаў, звязаных з касмагоніяй і касмалогіяй у міфарытуальных традыцыях еўразійскіх народаў;
– раскрыць міфасемантычныя аспекты фарміравання рытуальна-абрадавых практык сакральнага календара ў еўразійскіх міфапаэтычных традыцыях;

– паказаць структурна-семантычныя і зместава-сімвалічныя асаблівасці рытуальна-абрадавых комплексаў навалецця ў этнакультурнай спадчыне еўразійскіх народаў; сфарміраваць веды аб асноўных этапах гісторыі развіцця абрадавай культуры і яе святочных формаў;
– навучыць сінтэзаваць каштоўнасці матэрыяльнай і нематэрыяльнай этнакультурнай спадчыны Беларусі, вызначаць шляхі і спосабы актуалізацыі традыцыйных святочна-абрадавых практык у сучасным сацыякультурным працэсе;
– выявіць асаблівасці эвалюцыі традыцыйных каляндарна-абрадавых практык еўразійскіх народаў у кантэксце сучасных працэсаў глабалізацыі.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен
*ведаць:*

– гісторыю фарміравання каляндарных сістэм розных народаў свету;
– этапы развіцця свята як феномена сусветнай культуры, разнастайныя трактоўкі яго вызначэння і межы выкарыстання састаўных частак свята (міф, рытуал, абрад, культ);
– асаблівасці светапоглядных сістэм у розных традыцыйных культурах;
– універсальную структуру рытуальна-абрадавых комплексаў;
– асноўныя коды фарміравання святочна-абрадавых комплексаў;
– сэнсавую і каштоўнасную накіраванасць святочных формаўтварэнняў у культурах розных народаў свету;
– тэндэнцыі ў развіцці святочнай культуры Беларусі (прынцыпы арганізацыі пастановак святочных мерапрыемстваў, іх новыя формаўтварэнні);

*умець:*

– вылучаць адметныя рысы пэўнай гістарычнай эпохі і ўвасабляць іх у святочным дзеянні ў сучасных умовах;
– сістэматызаваць, параўноўваць і абагульняць веды пра рознапланавыя святочныя формаўтварэнні;
– распрацоўваць канцэптуальныя палажэнні аўтарскіх рэжысёрскіх праектаў на аснове ведаў па нематэрыяльнай культурнай спадчыне беларусаў;
– ажыццяўляць праекты фальклорна-этнаграфічнага вырашэння свят рознай тэматыкі, высокапрафесійна ўвасабляць ідэі абрадавых комплексаў на практыцы;
– выкарыстоўваць набытыя падчас вывучэння спецыяльнай дысцыпліны веды ў выкладчыцкай дзейнасці;

*валодаць:*

– метадамі і прыёмамі арганізацыі стварэння праектаў свят рознай тэматыкі з фальклорна-этнаграфічным вырашэннем;

– прынцыпамі пабудовы кампазіцыі, ведамі семантыкі і сімволікі галоўных персанажаў, атрыбутаў, рытуальных дзеянняў, адзення, слоў і іншых складовых частак свят рознай тэматыкі і розных гістарычных эпох;
– методыкай раскрыцця рытуальна-гульнёвай кампаненты традыцыйных абрадавых комплексаў.

Мэтанакіраванае і асэнсаванае выкарыстанне ведаў па гісторыі культуры, узнікнення календара, традыцыйных свят і абрадаў розных народаў свету, параўнальны аналіз агульных рыс і адметнасцей дапамагае сфарміраваць неабходныя кампетэнцыі сучаснага высокакваліфікаванага рэжысёра свят і абрадаў.

На засваенне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя свят», дасягненне пастаўленай мэты і вырашэнне задач прадугледжана 108 гадзін, з іх аўдыторных – 68: лекцыі – 50, семінарскія заняткі – 18 гадзін. Форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

# 1. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 Канспект лекцый

### Уводзіны

*Свята як частка культуры*

Прадмет, мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя свят» – адной са спецыяльных дысцыплін пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне святочнай культуры. Адна са спецыяльных дысцыплін модуля «Святочная культура Беларусі», выкладанне якой прадугледжана пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне сучаснай святочнай культуры, з'яўляецца базавай кампанентай у вывучэнні міфалагічных вытокаў рытуальна-абрадавай спадчыны і фарміраванні каляндарных сістэм розных народаў свету; прадугледжвае вывучэнне генезісу, структуры, сацыякультурных функцый міфа і рытуалу, месца фундаментальных катэгорый у фарміраванні этнакультурных карцін свету. Разгляд міфалагічных традыцый скіраваны на тыпалогію сістэм вярхоўных багоў і ніжэйшай дэманалогіі, іх цесную ўзаемасувязь з комплексамі каляндарных абрадавых практык. Важнай складовай дысцыпліны – разгляд беларускай міфарытуальнай сістэмы ў кантэксце агульнасусветнай міфалагічнай традыцыі. Мэта: раскрыць гісторыка-культурныя, міфасемантычныя і тыпалагічныя аспекты вывучэння рытуальна-абрадавых практык еўразійскіх народаў; на падставе структурна-семантычнага і зместава-сімвалічнага аналізу сфарміраваць ў студэнтаў неабходныя веды і кампетэнцыі ў галіне традыцыйных рытуальна-абрадавых практык, якія павінны спрыяць развіццю сучаснай святочнай культуры народа.

Культура – паняцці, ўстаноўкі, звычаі, святы і асаблівасці паводзін, агульныя для вялікай групы людзей і якія перадаюцца ад пакалення да пакалення.

Этымалогія феномена свята. Свята – гэта адрэзак часу, выдзелены ў календары ў гонар каго-небудзь ці чаго-небудзь, які мае сакральнае значэнне і звязаны з культурнай, рэлігійнай ці гістарычнай падзеяй.

Святочная культура – гэта неад'емная частка жыцця грамадства, гэта традыцыі, звычаі. Гэта від дзейнасці, які звязаны з гісторыяй, Палітыкай, падзеямі і датамі, рэлігіяй. Свята – устойлівы кампанент культуры, але надзвычай адчувальны да зменаў, якія адбываюцца ў грамадстве. Гэта від дзейнасці, які звязаны з гісторыяй, Палітыкай, падзеямі і датамі, рэлігіяй.

Сувязь з паняццямі «відовішча», «рытуал», «абрад», «цырымонія». Менавіта рытуал стаў стабілізуючым пачаткам, а традыцыя – свяшчэнны закон продкаў. Гэтай тэзы народных светапоглядных уяўленняў і палягае неабвержны

пастулат: адвечная традыцыя ёсць закон продкаў, закон, дадзены Богам, і парушаць яе, значыць, выракціся сваіх каранёў і ўгнявіць багоў. Рытуал або абрад – гэта спецыфічнае сакральна-магічнае дзеянне, якое набліжае чалавека да часу першатварэння свету і якое дадзена яму як літасць Божая, як здольнасць тварыць Гармонію сваімі рукамі, словамі і дзеяннямі. Той, хто ўключаецца ў працэс актуалізацыі рытуалу, знаходзіцца пад абаронай Творцы і, адпаведна, сам стварае вакол сябе ауру паразумення на ментальным, а не вербальным узроўні. І зусім іншымі фарбамі і выяўленчымі сродкамі малюецца носьбіт злых сіл. Процістаянне дзвюх сіл пададзена праз адносіны да святла, Сонца, агню [1, с. 64–72].

Іерафанія Сонца і Месяца. У аснове ўсіх адрэзкаў часу, якімі карыстаўся чалавек у сваёй земляробчай і святочна-абрадавай практыцы, а таксама ў побытавай будзённасці ляжалі прыродна-касмічныя цыклы, утвараемыя двума нябеснымі свяцiламі – Сонцам і Месяцам. Кожнае з іх задавала свой рытм зменлівасці ў стане прыроды і чаргавання гаспадарчых клопатаў, аднак паміж імі было прынцыповае функцыянальнае і структурафарміруючае падабенства, якое факусіравалася ў адных і тых жа фазах: нараджэння, развіцця, дасягнення росквіту, старэння і, нарэшце, немінучай смерці. Сонца паўплывала на ўзнікненне самай фундаментальнай, культурафарміруючай адзінкі вымярэння часу – года і адначасова на з'яўленне самай дынамічнай, рухомай, мабільнай адзінкі, якую назвалі суткамі. У межах гэтай часавай сістэмы вымярэння існаваў яшчэ адзін метранам – Месяц, поўны цыкла якога ўтвараў месяц, а адна з чатырох яго фазаў задавала структуру тыдня, працягласцю ў сем дзён. У гаспадарчай дзейнасці і міфарытуальнай практыцы гэтыя дзве сістэмы часавага парадкавання цесна ўзаемадзейнічалі па прынцыпе макрасістэмы (сонечны год) і мікрасістэмы Месяца (каляндарны месяц), якая адначасова падпарадкоўвалася ёй і пры гэтым праяўляла якасці незалежнай пульсацыі. У гадавым колазвароце існавалі так званыя цяжкія або неспрыяльныя дні. Яны паўтараліся з году ў год, незалежна ад таго, на які дзень або фазу Месяца яны прыпадалі. Што было вызначальным у гэтых датах? Сімволіка лічбавага коду, магчыма, астральная сімволіка, у якой былі закадзіраваны "усплескі" сонечнай актыўнасці, а, магчыма, у гэтым ланцугу Праметэя была засакрэчана мантыка хрысціянскіх падзей (зверскія забойствы прыхільнікаў новай веры, праблемныя сітуацыі ў місіянерскай дзейнасці бліжэйшых вучняў Хрыста – апосталаў?

Уздзеянне міфаў, культаў, магіі, вераванняў, рэлігіі на фарміраванне свята, абраду, рытуалу і іншых урачыстых падзей.

Класіфікацыя свят і абрадаў: дзяржаўныя – народныя; рэлігійныя – грамадзянскія; масавыя – сямейныя (асабістыя); вулічныя – хатнія; дарослыя (18+) – дзіцячыя (0+); спартыўныя, прафесійныя.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Вызначыце змест і сутнасць паняцця “культура”.
2. Вызначыце асноўныя рысы паняцця “свята”.
3. Вызначыце асноўныя рысы паняцця “святочная культура”.
4. Як уплывае цыкл Сонца і цыкл Месяца на ўзнікненне свят?
5. Пакажыце сувязь свята з такімі паняццямі як «відовішча», «рытуал», «абрад», «цырымонія».
6. Патлумачце класіфікацыю свят.

**Літаратура:**

*Катовіч, А. В.* Веснавыя святы : у 2 кн. / А. В. Катовіч, І. І. Крук. – Кн. 2. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 413 с.
*Котович,* О. В. Сакральный мир традиции. 99 уроков народной культуры : науч. изд. / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2018. – 578 с.
*Махлина,* С.Т. Художественная культура Востока. Повседневность и праздники : учеб. пособие для вузов / С. Т. Махлина. – Москва : Юрайт, 2020. – 194, [1] с. : рис. ; 25х16 см. – (Высшее образование).

## Раздзел І. Гісторыя фарміравання беларускай святочнай культуры: палілог каляндарных сістэм

### *Тэма 1. Каляндар як складовая частка культуры. Месяцовы і сонечны календары. Параўнальны аналіз сусветных старажытных календароў*

Культуралагічнае паняцце «каляндар». Слова “каляндар” паходзіць ад старажытнарымскага “календы”(“calendae”), што азначала: першыя чыслы кожнага месяца (дні маладзіка). Найменне адпавядае і слову “каляндарыум” – кніга, куды запісваліся даўгі, працэнты па якіх патрэбна было плаціць, і маладзіковыя дні. Месяцавыя (“лунные”) меры часу – найстаражытнейшыя. Лік часу толькі па звароту Месяца, што існаваў у першабытным грамадстве, называўся месяцавым календаром.

Легенды аб стварэнні свету. Міфалагічная цыклічнасць часу. Біблейскія паданні аб часе стварэння свету. Лінейнасць у хрысціянскай канцэпцыі часу. Умоўнасць «кропкі адліку» часу. Эра ад стварэння свету. Хрысціянская эра: ад нараджэння Хрыста.

Салярная і месяцовая аснова ў гадавым колазвароце сельскагаспадарчых работ. У аснове ўсіх адрэзкаў часу, якімі карыстаўся чалавек у сваёй земляробчай і святочна-абрадавай практыцы, а таксама ў побытавай будзённасці ляжалі прыродна-касмічныя цыклы, створаныя двума нябеснымі свяцiламі – Сонцам і

Месяцам. Кожнае з іх задавала свой рытм зменлівасці ў стане прыроды і чаргавання гаспадарчых клопатаў, аднак паміж імі было прынцыповае функцыянальнае і структурафарміруючае падабенства, якое факусіравалася ў адных і тых жа фазах: нараджэння, развіцця, дасягнення росквіту, старэння і, нарэшце, немінучай смерці. Сонца паўплывала на ўзнікненне самай фундаментальнай, культурафарміруючай адзінкі вымярэння часу – года і адначасова на з'яўленне самай дынамічнай, рухомай, мабільнай адзінкі, якую назвалі суткамі. У межах гэтай часавай сістэмы вымярэння існаваў яшчэ адзін метраном – Месяц, поўны цыкла якога ўтвараў месяц, а адна з чатырох яго фазаў задавала структуру тыдня, працягласцю ў сем дзён. У гаспадарчай дзейнасці і міфарытуальнай практыцы гэтыя дзве сістэмы часавага парадкавання цесна ўзаемадзейнічалі па прынцыпе макрасістэмы (сонечны год) і мікрасістэмы Месяца (каляндарны месяц), якая адначасова падпарадкоўвалася ёй і пры гэтым праяўляла якасці незалежнай пульсацыі. У гадавым колазвароце існавалі так званыя цяжкія або неспрыяльныя дні. Яны паўтараліся з году ў год, незалежна ад таго, на які дзень або фазу Месяца яны прыпадалі. Што было вызначальным у гэтых датах? Сімволіка лічбавага коду, магчыма, астральная сімволіка, у якой былі закадзіраваны "успляскі" сонечнай актыўнасці, а, магчыма, у гэтым ланцугу Праметэя была засакрэчана мантыка хрысціянскіх падзей (зверскія забойствы прыхільнікаў новай веры, праблемныя сітуацыі ў місіянерскай дзейнасці бліжэйшых вучняў Хрыста – апосталаў?

Хто і калі заводзіў спружыну каляндарных святкаванняў? Надзвычайную цікавасць уяўляе пытанне аб часе правядзення тых ці іншых святаў. Фундаментальны і нясучы "стрыжань" беларускага народнага календара – святы у гонар бога Сонца: Каляды, Вялікдзень, Купалле, Багач. Калі з чатырма асноўнымі святамі традыцыйнага календара, якія суадносіліся з ключавымі фазамі ў руху Сонца па небасхіле – у гэтым выразна бачны астракасмічны пачатак, - то ўсё астатняе ўяўляецца феноменам духоўнай і працоўнай дзейнасці аднаго соцыума або вялікай сям'і народаў.

Уплыў іерафаніі Месяца і Сонца на фарміраванне сістэмы парадкавання часу. Змена фазаў Месяца як першааснова парадкавання часу. Адзінкі вымярэння часу на аснове цыклічнасці Месяца: тыдзень, месяц. Старажытныя месяцовыя календары: іўдзейскі, мусульманскі, рымскі. Асновы пабудовы старажытных месяцовых календароў шумераў і вавіланян.

Традыцыйныя ўяўленні аб асноўных пераходных момантах у задыякальным руху: дні зімовага і летняга сонцастаяння (самая кароткая ноч і самы працяглы дзень), веснавога і восеньскага раўнадзенства (дзень і ноч роўныя, па 12 гадзін). Старажытнаегіпецкі сонечны каляндар. Свяшчэнная лічба бога Ра (365).Салярная цыклічнасць як аснова фарміравання каляндарных сістэм

розных народаў. Паняцце «сонечны год». Адзінкі вымярэння часу на аснове сонечнай цыклічнасці: суткі і год.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Вызначыце змест і сутнасць паняцця "каляндар"?
2. Якую ролю адыгрывае каляндар у святочнай культуры?
3. Як вы разумееце паняцце цыклічны і лінейны час?
4. Пералічыце вядомыя месяцовыя календары?
5. Якое адкрыццё зрабілі старажытныя егіпцяне?
6. Як вы разумееце паняцце "эра"?

**Літаратура:**

*Катовіч,* А. В. Зімовыя святы : навук.–папуляр. выд. / А. В. Катовіч, І. І. Крук. – Мінск : Маст. літ., 2004. – 119 с.

*Котович, О. В.* Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.

*Махлина,* С.Т. Художественная культура Востока. Повседневность и праздники : учеб. пособие для вузов / С. Т. Махлина. – Москва : Юрайт, 2020. – 194, [1] с. : рис. ; 25х16 см. – (Высшее образование).

*Тэма 2. Шляхі фарміравання юліянскай сістэмы летазлічэння як прататыпа сучаснага календара*

Перадумовы рэформы старажытнарымскага календара: год пачынаецца 1 сакавіка ў гонар бога вайны Марса. Назвы месяцаў у гонар багоў і па парадкаваму нумару. Гістарычная роля Гая Юлія Цэзара і грэчаскага астранома Сазігена Александрыйскага ў вызначэнні даўжыні сонечнага года. Вынаходніцтвы старажытных егіпцян. Свяшчэнная лічба бога Ра (365). Паняцце «пачатак новага года». Перанос сустрэчы новага года на 1 студзеня. Традыцыйныя перадумовы сустрэчы новага года. Бог сустрэчы – Янус і бог падземнага царства Фебруус. Дванаццацімесяцовы каляндарны год. Структурнае парадкаванне часу па месяцах. Гісторыя фарміравання сістэмы каляндарных працягласцей. Пастаянная дата дня веснавога раўнадзенства – 21 сакавіка. Высакосны дзень (29 лютага) і высакосны год, замацаваны у месяцы, прысвечаным богу падземнага царства Февруусу. Матэматычны разлмк высакоснага года. Ушанаванне стваральніка новай сістэмы злічэння часу Юлія Цэзара (месяц ліпень – Іюліус) і яго паслядоўніка рымскага імператара Аўгуста (жнівень). Год увядзення юліянскага календара – 46 г да н.э. Першыя праблемы ўвядзення новага матэматычнага календара. Дапамога рымскага імператара Августа.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Вызначыце ролю традыцыйных умоў сустрэчы новага года пры увядзенні новага юліянскага календара.

2. Якую ролю адыгрываюць багі ў назвах месяцаў года ў юліянскім календары.
3. У які месяц “схавалі” дабавачны высакосны дзень і чаму.
4. Якія вылічэнні дапамагаюць вызначыць высакосны год сярод астатніх гадоў.
5. Назавіце год увядзення юліянскага календара.
6. Як ушанавалі памяць стваральніка юліянскага календара.
7. Як ушанавалі памяць імператара Аўгуста ў стваральніка юліянскага календара

**Літаратура:**

*Катовіч,* А. В. Зімовыя святы : навук.–папуляр. выд. / А. В. Катовіч, І. І. Крук. – Мінск : Маст. літ., 2004. – 119 с.
*Котович, О. В.* Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.
*Махлина,* С.Т. Художественная культура Востока. Повседневность и праздники : учеб. пособие для вузов / С. Т. Махлина. – Москва : Юрайт, 2020. – 194, [1] с. : рис. ; 25х16 см. – (Высшее образование).

*Тэма 3. Светапоглядныя асновы хрысціянства.*
*Прынцыпы структуравання хрысціянскага календара.*
*Свята Пасхі. Пасхалія. Уплыў праваслаўнай Пасхаліі*
*на структуру беларускага народнага календара.*

Новая гісторыя існавання чалавецтва на зямлі, новыя крытэрыі засваення часу. Царква як сацыяльны інстытут распаўсюджання хрысціянскай традыцыі. Каталіцызм, праваслаўе, пратэстантызм.

Гістарычная роля Нікейскага сабора (325 г.) у фарміраванні будучага сусветнага календара. Доўгі час хрысціянскія багасловы шукалі адказ на пытанне: калі святкаваць Уваскрэсенне Хрыста. Складаную гістарычную праблему вырашылі ў 325 г. на Нікейскім Усяленскім Саборы. Хрысціянская Пасха святкуецца ў першую нядзелю пасля першай *поўні*, якая надыходзіць пасля дня веснавога раўнадзенства (21 сакавіка). Яшчэ адна акалічнасць: адзначаць хрысціянскую Пасху толькі пасля святкавання іўдзейскай Пасхі. Так у юліянскую сістэму парадкавання часу быў дапасаваны хрысціянскі каляндар, у якім адна з ключавых падзей вызначалася па двух астранамічных складовых адначасова: рух Сонца па небасхіле і рытмічнае чаргаванне фазаў Месяца.

Гістарычнае значэнне прыняцце юліянскага календара. У дахрысціянскую эпоху ўсходнія славяне (як і большасць еўрапейскіх народаў) кропкай адліку існавання чалавецтва лічылі той міфалагічны час, калі быў створаны свет – эра *ад Утварэння свету*. Увядзенне эры злічэння часу ад Раства Хрыстова. Хрысціянская культура прынесла і замацавала ў свядомасці людзей новую

кропку адліку часу – *ад Раства Хрыстова*. Першыя дакументы, пазначаныя датай ад Раства Хрыстовага (скарочана Р. Х.) з'явіліся, па розных меркаваннях, у V–VII стст. Зацвердзілася новае летазлічэнне амаль што ў сярэдзіне XVIII ст., але Праваслаўная Царква доўгі час працягвала карыстацца эрай ад Утварэння свету

Асаблівасці святкавання іўдзейскай Пасхі: сузалежнасць сонечнага – веснавое раўнадзенства – і месяцовага календароў – першы дзень поўні. Сэнсава-семантычныя аспекты паняцця «пасха» – выхад, зыход, уратаванне. Тайная вячэра, або апошняя Пасха, у жыцці Ісуса Хрыста – вечар з серады на чацвер – святкаванне іўдзейскай Пасхі.

Гісторыя фарміравання і структурная ўпарадкаванасць хрысціянскага календара: ушанаванне асноўных падзей з жыцця Ісуса Хрыста і Дзевы Марыі. Распрацоўка правілаў вызначэння даты святкавання хрысціянскай Пасхі. Пасхалія, або час Хрыста.

Доўгі час хрысціянскія багасловы шукалі адказ на пытанне: калі святкаваць Уваскрэсенне Хрыста. Складаную гістарычную праблему вырашылі ў 325 г. на Нікейскім Усяленскім Саборы. Хрысціянская Пасха святкуецца ў першую нядзелю пасля першай *поўні*, якая надыходзіць пасля дня веснавога раўнадзенства (21 сакавіка). Яшчэ адна акалічнасць: адзначаць хрысціянскую Пасху толькі пасля святкавання іўдзейскай Пасхі. Так у юліянскую сістэму парадкавання часу быў дапасаваны хрысціянскі каляндар, у якім адна з ключавых падзей вызначалася па двух астранамічных складовых адначасова: рух Сонца па небасхіле і рытмічнае чаргаванне фазаў Месяца.

У адпаведнасці з пастановай Нікейскага сабору (325 г.) Вялікдзень адзначаецца ў першую нядзелю пасля веснавога раўнадзенства і першай поўні пасля яго. Такая астранамічная прымеркаванасць зрабіла свята рухомым, пераходным. Яно можа адзначацца з 4 красавіка да 6 мая.

Асаблівасці структуравання хрысціянскай Пасхаліі – «календара ў календары»: 70 сяточных дзён перад Вялікаднем і 70 святочных дзён пасля Вялікадня. Яшчэ адной прынцыповай асаблівасцю хрысціянскага ўспрыняцця часу стаў Пасхальны цыкл, які ахопліваў прастору ў межах дваццаці тыдняў. Гэты абрадава-сакралізаваны прамежак часу сканцэнтраваў у сабе галоўныя падзеі, якія тычацца апошніх дзён зямнога жыцця Хрыста, яго смерці, Уваскрэсення і Узнясення. Хрыстос пераадолеў межы зямнога існавання. Гэта асноваўтваральная ідэя была перанесена і на структуру Пасхаліі. У яе пастаяльным руху з'яўляецца даволі працяглы па часе перыяд, які папярэднічае Вялікадню (10 тыдняў) і столькі ж доўжыцца пасля яго. Гэты сегмент як бы «разарваў» храналагічную паслядоўнасць хрысціянскай светабудовы. Пасхальны цыкл стаў выключэннем з жыццёвых правіл зямлян і фактычна атрымаў статус Свяшчэннага часу, які ўзнёсся над звыклай, прафаннай

будзённасцю і над сакральным часам святочнай рэчаіснасці. Кажучы іначай, жыццё Хрыста аб'яднала ў сабе два разуменні часу, дзве парадыгмы яго асэнсавання. Узнясенне на Нябёсы – гэта і ёсць узнясенне над часам, якім вымяраецца жыццё на зямлі.

Суаднесенасць веснавых свят беларускага народнага календара з пасхальным цыклам: рухомыя і нерухомыя святы. З прыходам хрысціянства і актыўным пашырэннем у сферы сацыяльнага і культурнага жыцця грамадства святаў хрысціянскай Пасхаліі і ў сувязі з увядзеннем сямітыднёвага Вялікага посту, які папярэднічаў падзеям Вялікадня, святкаванне Масленіцы: павінна было скончыцца да пачатку посту; скарацілася з двух тыдняў да аднаго; набыло дадатковыя рысы ў змесце, сімволіцы і абрадавых падзеях. Веснавыя нерухомыя і рухомыя, сузалежныя ад штогадовага святкавання Вялікадня (Пасхі) – Масленіца (восьмы тыдзень перад Вялікаднем), Вербніца (сёмы дзень перад Вялікаднем), Радаўніца (дзевяты дзень пасля Вялікадня ў аўторак), Ушэсце (саракавы дзень пасля Вялікадня ў чацвер), Семушны тыдзень (сёмы тыдзень пасля Вялікадня), Русальны тыдзень (восьмы тыдзень пасля Вялікадня).

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Якая галоўная ідэя пакладзена ў аснову хрысціянства?
2. Якія падзеі былі пакладзены ў аснову пабудовы і структуравання хрысціянскага календара.
3. Як вы разумееце старажытнаіўдзейскае слова "пасха"?
4. Як вызначаецца дзень святкавання Іўдзейскай Пасхі?
5. Як вызначаецца дзень святкавання Хрысціянскай Пасхі?
6. Які ўплыў аказала святкаванне хрысціянскай Пасхі на старажытныя народныя святы беларускага календара?
7. Патлумачце паняцці «рухомыя» і «нерухомыя святы».

**Літаратура:**


*Катовіч,* А. В. Веснавыя святы : у 2 кн. / А. В. Катовіч, І. І. Крук. – Кн. 1. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 359 с.

*Котович, О. В.* Золотые правила народной культуры / О. Котович, Я. Крук. – 12-е изд. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2017. – 592 с. (47, 73 печ. л.)


## *Тэма 4. Дыялог культур: суіснаванне традыцыйнага народнага і хрысціянскага календароў у гістарычным кантэксце. Грыгарыянская рэформа хрысціянскага календара*

Прыняцце ўсходнеславянскімі народамі хрысціянскай рэлігійнай традыцыі з цягам часу прывяло да шматлікіх і значных змен у духоўным жыцці беларускага этнасу. Па-першае, хрысціянства прынесла з сабой прынцыпова іншую светапоглядную сістэму, іншую версію аб паходжанні свету і тых сілах,

якія ўтрымлівалі гармонію суіснавання чалавека, соцыуму, прыроды, космасу. Па-другое, хрысціянства абапіралася на зусім іншае разуменне часу, а таксама своеасаблівую сістэму яго парадкавання і асэнсавання. Можна без перабольшання сказаць, што змены закранулі фундаментальныя асновы ў асэнсаванні часу як найважнейшай светапогляднай катэгорыі.

Прыняцце хрысціянства ўсходнеславянскімі народамі: 998 г., Кіеўская Русь, 10-16 ст.ст, распаўсюджванне хрысціянства на землях пражывання беларусаў (праваслаўе і каталіцызм). Складаны духоўныя, светапоглядныя, сацыякультурныя, прававыя і палітычныя аспекты працэсу суіснавання дзвюх культур – народнай і хрысціянскай. Дыялог культур – гэта ўзаемадзеянне, узаемаўплыў, узаемапранікненне культур розных краін і народаў, фарміраванне агульных культурных зон і агульначалавечых духоўных каштоўнасцей

Спецыфіка суіснавання дыялогу дзвюх культур. Асаблівасці міфасемантыкі народных традыцый (у аснове пабудовы беларускага народнага календара (БНК) ляжыць рух Зямлі вакол Сонца) і хрысціянскай ідэалогіі (у аснове пабудовы хрысціянскага календара (ХК) ляжаць падзеі, звязаныя з Дзевай Марыяй, Езусам Хрыстом, іх вучнямі і прадаўжальнікамі хрысціянства). Гістарычны шлях трансфармацыі асноўных святаў беларускага традыцыйнага календара. Паняцце «двухвер'е», або «народнае праваслаўе». Уплыў феномена беларускай ментальнасці на збліжэнне дзвюх каляндарных сістэм. Сэнсава-семантычная абумоўленасць узнікнення абрадавых комплексаў традыцыйнай культуры.

Касмізм юліянскага календара (неадпаведнасць юліянскага года трапічнаму, або сонечнаму, цыклу). Супярэчнасці суаднесенасці прыродна-касмічнага упарадкавання календара вызначэння даты святкавання хрысціянскай Пасхі як перадумова неабходнасці рэфармавання юліянскага календара.

Гістарычная роля Папы Рымскага Грыгорыя XIII у рэфармаванні календара. Умовы каляндарнай рэформы. У XVI стагоддзі н. э. Папа Рыгор XIII звярнуў увагу на тое, што, згодна з юліянскім календаром, Вялікдзень (свята Уваскрэсення Хрыстова) штогод выпадае на розныя дні тыдня, хоць павінна святкавацца менавіта ў нядзелю. Гэта значыць стала прыкметна, што дзень вясновага раўнадзенства ссоўваецца за кожныя 128 год на адны суткі. У выніку былі падрыхтаваны умовы рэфармавання Юліянскага календара: пасля 1 кастрычніка адразу наступіць 15 кастрычніка (розніца ў 10 дзён), кожныя 400 гадоў выкідваць 3 дні. С цягам часу рэфармаваны юліянскі каляндар назавуць новым, грыгарыянскім, еўрапейскім календаром.

Паступовае прыняцце грыгарыянскай рэформы краінамі свету. Пратэст Рускай праваслаўнай царквы супраць грыгарыянскай рэформы. Перадумовы пераходу дзяржаўнага летазлічэння Савецкай Расіі на грыгарыянскі стыль

(розніца ў 13 дзён). Рэфармаванне календара або пераход на новы, еўрапейскі каляндар дэкрэтам У.І. Леніна ў 1918 г. Стары стыль, новы стыль.

Структура рытуальна-абрадавага комплексу, яе асноўныя складовыя. Назва народнага календара (рэгіянальныя варыянты) і хрысціянскага календара. Міфалагічныя вытокі (для святаў народнага календара). Гісторыя хрысціянства (для святаў хрысціянскага календара). Час правядзення. Прымеркаванасць правядзення святочнага абраду да руху Сонца, пары года, фазы Месяца, дня тыдня або ўніверсальнага рытму жыцця. Даты календара згодна канфесійных прыналежнасці або іншых сувязей. Месца правядзення абраду (сімвалічныя прыродна-ландшафтныя мясціны; сімвалічныя "памежныя" мясціны; месцы, звязаныя з працай чалавека або яго існаваннем). Неабходныя рытуальныя персанажы. Абавязковае рытуальнае адзенне і рытуальныя атрыбуты. Умова наяўнасці рытуальнай ежы. Рытуальныя дзеянні падчас выканання абраду. Рытуальные словы: песні – гімны; велічальныя песні; пажаданні, загуканні; заклінанні; галашэнні; праклёны; дражнілкі; лічылкі; замовы; малітвы. Рытуальныя танцы і тэатралізаваныя ігрышчы. Варажба: прадказанне будучага: ураджаю, стану гаспадаркі, сямейнага становішча і г.д. Назіранні за станам надвор'я.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Як вы разумееце паняцце "дыялог культур"?
2. Як адбывалася спалучэнне беларускага традыцыйнага народнага і хрысціянскага календароў у гістарычным кантэксце?
3. Якія недакладнасці юліянскага календара сталі перадумовай для яго рэфармавання?
4. Якія правілы сталі галоўнымі падчас рэфармавання календара Папай Рымскім Рыгорам 13?
5. Як адбывалася рэфармаванне календара у 1918 г.?
6. Прывядзіце прыклады дат гістарычных падзей у пераліку на новы і стары стыль
7. Вызначыце асноўныя адзінкі вымярэння часу
8. Пакажыце прыродазнаўчыя асновы фарміравання традыцыйнага календара беларусаў.
9. Раскрыйце сэнс тэорыі каляндарных сегментаў.
10. Прывядзіце прыклады на кожную складовую "Структуры рытуальна-абрадавага комплексу традыцыйнай культуры".

**Літаратура:**

*Катовіч,* А. В. Зімовыя святы : навук.–папуляр. выд. / А. В. Катовіч, І. І. Крук. – Мінск : Маст. літ., 2004. – 119 с.

*Катовіч,* А. В. Веснавыя святы : у 2 кн. / А. В. Катовіч, І. І. Крук. – Кн. 1. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 359 с.

*Котович, О. В.* Золотые правила народной культуры / О. Котович, Я. Крук. – 12-е изд. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2017. – 592 с. (47, 73 печ. л.)

## Раздзел ІІ. Традыцыйныя рытуалы і святы ў сусветных культурах

### *Тэма 1. Культы і святкаванні старажытных цывілізацый.*

Архаічныя культы з'яўляліся формай і сродкамі камунікацыі старажытнага чалавека з космасам і прыродай. Яны выяўляліся як ушанаванне стыхійных прыродных сіл і духаў памерлых продкаў. Па-сутнасці архаічныя культы і ўяўленні чалавека пра сусвет выступалі фактарам культурнай сацыялізацыі і асваення чалавекам фізічна-матэрыяльнай прасторы. У беларускай традыцыйнай культуры да сённяшняга часу захаваліся рэшткі многіх культаў і архаічных вераванняў, што ўказвае на развітасць у нашых продкаў міфалагічнай свядомасці.

У апошні час значная ўвага пачала ўдзяляцца міфалагічным вытокам розных форм жанравай арганізацыі, параўнальным аспектам даследавання, структурна-функцыянальным асаблівасцям, цеснай ўзаемасувязі песнятворчасці з абрадамі. У сувязі з гэтым неабходна адзначыць, што акрэсленая дысцыпліна насамрэч мае інтэрдысцыплінарны характар: яна аб'ядноўвае тэарэтычныя распрацоўкі і падыходы культуралагічны, міфалагічны, фалькларыстычны, этнаграфічны, антрапалагічны, этналінгвістычны, псіхалагічны, фенаменалагічны, герменэўтычны, аксіялагічны. Паспрабуем патлумачыць міждысцыплінарны падыход толькі на адным прыкладзе. На Беларусі найбольш шырокі арэал бытавання мае каляндны рытуальна-абрадавы комплекс. Ён цесна знітаваны з міфалагічнай сістэмай асэнсавання Часу, цыклічнасцю космасу, постаці калядоўшчыкаў – прадстаўнікі нябеснага пантэону вярхоўных багоў (герменеўтычны аспект), касмічная ўпарадкаванасць пераносіцца на антрапакосм сям'і гаспадара (антрапалагічны падыход); госці-багі-калядоўшчыкі прыходзяць з казой – сімвалам Сонца (фенаменалагічны падыход); псіхалогія ўспрымання сітуацыі абапіраецца на міфалагемы і архетыпы. Якія месцяцца ў падсвядомасці чалавека, якая непарыўна звязана з агульнаэтнічным калектыўным несвядомым.

Культ (ад лац. cultus) – шанаванне, пакланенне. Рэлігійнае шанаванне якіх-небудзь багоў і прадметаў (святыя выявы, скульптуры); якое ўключае абраднасць і цырыманіяльнасць. Значныя рэлігійныя рытуалы і святы фараонаў. Рэлігія – гэта вера чалавека ў існаванне звышнатуральных сіл (Бога, багоў, духаў), якая

дапамагае зразумець свет і дае арыенціры ў жыцці. У чым адрозненні "культу" і "рэлігіі"? У рэлігіях лідэры (папы, патрыярхі, ламы) – гэта служыцелі традыцыі або Бога. У культах лідэр – гэта цэнтр светабудовы, які валодае абсалютнай уладай, часта аб'яўляе сябе жывым Богам ці адзінай крыніцай ісціны. Рэлігіі звычайна інтэграваныя ў грамадства і не забараняюць кантакты з знешнім светам. Культы часта выкарыстоўваюць ізаляцыю, псіхалагічны ціск і фінансавую эксплуатацыю.

Культы і святкаванні старажытных цывілізацый. Сезонныя перыяды працы і адпачынку ў абрадава-святочнай дзейнасці культур старажытнасці. Тыпалогія свят у Старажытным Егіпце. Культ старажытных егіпцян – заснаваная на глыбокай пашане сілам прыроды, абагаўленні жывёл, фараона і веры ў замагільнае жыццё. Галоўнымі багамі былі Ра (сонца), Асірыс (адраджэнне), Ісіда (мацярынства) і Амон. Асновай рэлігіі было падтрыманне парадку Маатен, захаванне рытуалаў жрацамі і культ мёртвых, які ўключаў муміфікацыю для захавання душы.

Культы Старажытнай Месапатаміі ўяўлялі сабой кожны горад-дзяржава (Шумер, Акад,Вавілон) меў сваіх заступнікаў. Галоўнымі элементамі былі зіккураты, пакланенне багам прыроды (Ану, Энліль, Эа) і Іштар, а таксама вера ў тое, што людзі створаны для служэння багам праз ахвярапрынашэння і рытуал “Святога шлюбу».

Індыйская цывілізацыя грунтаваўся на паганстве, глыбокай пашане сілам прыроды, кульце ўрадлівасці, жаночых бажаствоў і прататыпа Шывы. Характэрныя выявы жывёл, Святыя дрэвы, выкарыстанне кудменяў і пячатак, што заклала асновы індуізму. Развітая гарадская культура адрознівалася высокай гігіенай, каналізацыяй, аднастайнай архітэктурай і рамёствамі.

Цывілізацыя атцекаў існавала з элементамі анімізму, заснаваная на глыбокай пашане сілам прыроды, магіі і маштабных чалавечых ахвярапрынашэннях, неабходных для падтрымання касмічнага цыклу. Галоўны бажаствамі былі Уіцылапочтлі (сонца / вайна) а рытуалы праводзіліся на вяршынях пірамід, суправаджаючыся вырываннем сэрца.

Культы ў Старажытнай Грэцыі грунтаваліся на шанаванні алімпійскіх багоў, герояў і мясцовых бажаствоў-заступнікаў. Рэлігія ўключала ахвярапрынашэнні, малітвы ў храмах (напрыклад, Афіне, Зеўсу) і аракулы (Дэльфы), пераплятаючыся з міфалогіяй, спортам (Алімпійскія Гульні) і мастацтва. Адной з галоўных асаблівасцяў быў таксама культ герояў-шанаванне смяротных нашчадкаў багоў або выбітных людзей. Міфалогія старажытных грэкаў як аснова абрадавых дзей. Галоўныя святы ў культуры Старажытнай Грэцыі: свята ў гонар збору ўраджая вінаграду «Дзіянісавы дзеі»; Афінскія, Панафінскія, Піфійскія і іншыя гульні. Відовішчы ў старажытнагрэчаскім амфітэатры. З’яўленне Алімпійскіх гульняў.

Агульнагрэчаскі пантэон: Зеўс, Афіна, Апалон, Афрадзіта, Гера, Пасейдон, Арцеміда і інш. Земляробчыя боствы, тытаны, культурныя героі.Жрацы і храмы. Сувязь грэчаскіх свят з рэлігійнымі рытуаламі, абрадамі: *культавыя дзействы, ахвярапрынашэнні, адкупленчыя цырымоніі, урачыстыя працэсіі*. Правядзенне*гульняў, містычных прысвячэнняў, аргаістычных ўрачыстасцяў, ахвярапрынашэнняў*. Святы Антычнасці ўключалі *ўрачыстыя шэсці, музычна-драматычныя прадстаўленні*, харэаграфію, яркае афармленне. Шырокае развіццё атрымалі *спаборніцтвы (атлетычныя, музычныя), узнагароджанне і ўшанаванне пераможцаў*. Гэта садзейнічала развіццю драмы, музычна-паэтычнай творчасці, у прыватнасці харавых спеваў і танцаў.

Рымскі пантэон: Марс, Венера, Сатурн, Юпіцер, Меркурый і інш. Культ полісных багоў. Рытуалы і святы. *Гладыятарскія баі, публічныя сцэны з драпежнымі звярамі* для забавы шматтысячнага натоўпу.Выраз *хлеба і відовішчаў* (лац. *panem et circenses*) як сімвал палітыкі подкупу плебса дзеля ўтрымання патрыцыямі ўлады ў Старажытным Рыме. Атэлана, буфанада, сатурналія як састаўныя часткі свят Апалона, Плебейскіх і Рымскіх гульняў.

У беларусаў у першую чаргу гэта культ продкаў. Нават перад шлюбам маладыя заходзілі ў суботу на магілы продкаў, а на ўсе галоўныя святы года першы блін клалі на сподак і ставілі ў чырвоны кут – продкам.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Як вы разумееце паняцце “культ”?
2. Як вы разумееце паняцце “рэлігія”?
3. Чым адрозніваюцца “культ” і “рэлігія”?
4. Назавіце вядомых вярхоўных багоў егіпецкай міфалогіі?
5. Як называлася багіня кахання і ўрадлівасці ў Вавілоне?
6. Назавіце галоўны культ для беларусаў?
7. Назавіце вядомых багоў славянскай міфалогіі?

**Літаратура:**

*Беларуская міфалогія :* энцыкл. слоўнік / рэдкал.: С. Санько (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск : Беларусь, 2006. – 599 с.

*Вуглік, І. Р.* Міфалогія беларусаў : навуч.-метадыч. дапаможнік / І. Р. Вуглік. – Мінск : Сучасныя веды, 2005. – 151 с.

*Калачова, І. І.* Народныя традыцыі і звычаі выхавання: этнапедагагічная спадчына этнасаў Беларусі / І.І.Калачова. – Мінск: Беларусь, 1999. – 179 с.

*Коваль, У. І.* Народныя ўяўленні, павер’і і прыкметы: даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі / У.І. Коваль. – Гомель, 1995. – 180 с.

*Ненадавец,* А. М. Міфалогія роднага краю / А. М. Ненадавец. – Мінск : Беларусь, 2018. – 399 с.

*Новак,* В. С. Міфалогія беларусаў / В. С. Новак. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2005. – 252 с.

*Шамякіна,* Т. І. Міфалогія Беларусі: нарысы: вучэб. дапаможнік / Т. І. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 399 с.

### *Тэма 2. Гісторыя асноўных традыцыйных свят усходніх краін (Кітай, Японія).*

Дунчжыцзэ – свята ў гонар зімовага сонцастаяння ў Старажытным Кітаі. Новы год, або Свята вясны. Першы Новы год амаль не адрозніваецца ад звыклага нам. Ён адзначаецца гэтак жа, як у Беларусі, У ноч з 31 снежня на 1 студзеня. Другі Новы год у Кітаі называецца святам вясны, або (Чунь цзе). Яго адзначаюць па ўсходнім календары, але дата святкавання мяняецца кожны год, у залежнасці ад месяцовага цыклу. Ён доўжыцца на працягу першых пятнаццаці дзён кітайскага месяцовага календара, які па заходнім летазлічэнні пачынаецца дзесьці паміж 21 студзеня і 21 лютага. Падрыхтоўка да святкавання Новага года па месяцовым календары ў жыхароў Кітая звычайна пачынаецца прыкладна за 2 тыдні да свята.

У кітайцаў ёсць такая прымаўка – “вясна ўвесь год плануюˮ. Гэта адлюстроўвае стаўленне жыхароў краіны да Новага года па месяцовым календары. Яшчэ вельмі холадна, але свята азначае заканчэнне самых халодных дзён і набліжэнне цяпла. Людзі вітаюць вясну і тое, што яна прыносіць з сабой: і гэта не толькі пасевы і ўраджаі, але і пачынанні, надзея на лепшае жыццё і на тое, што на працягу года ўсё будзе добра.

Паводле гістарычных дакументах, у дзень, калі Юй Шунь, адзін з міфалагічных старажытных кітайскіх імператараў, уступіў на пасад (больш чым 4000 гадоў таму), ён прывёў сваіх міністраў, каб пакланіцца небе і зямлі. З тых часоў, гэты дзень лічыўся першым днём першага месяцовага месяца ў кітайскім календары. Гэта асноўная версія паходжання кітайскага Новага года. Але ў 1911 годзе Кітай прыняў Грыгарыянскі каляндар, і кітайскі Новы год быў перайменаваны ў свята Вясны.

Кожны год праходзіць пад заступніцтвам аднаго з 12 жывёл розных кветак і 4 стыхій. Гэтыя камбінацыі паўтараюцца ўсяго толькі раз у 60 гадоў.

Пачвара, чырвоны колер і шмат шуму: Дзеці Беларусі з нецярпеннем чакаюць Новага года, каб добры дзядуля Мароз прыйшоў, нарэшце, з падарункамі і весялосцю. У Кітаі ж, наадварот, напярэдадні святочнай ночы прыходзіць Пачвара Нянь, якое пажырае жывёлу і ўраджай. Кітайцы залагоджваюць Пачвара прысмакамі ля парога, адпужваюць яго феерверкамі і шумам, а звонку абараняюць дом багаццем чырвонага колеру. Паводле легенды, Нянь спалохаўся трэска бамбука ў вогнішчы і малога ў чырвонай вопратцы, таму ўцёк і пакінуў гараджан у спакоі. Менавіта гэтая легенда паклала пачатак вялікай

Яшчэ адным значным фактарам сувязі паміж русалкамі, вільгаццю (вадой і ўрадлівасцю зямлі) з'яўдяецца знешняе аблічча гэтых дэманалагічных істот. Усе спявачкі звычайна падкрэсліваюць тры адметныя рысы: адсутнаць адзення, распушчаныя валасы і вялікія грудзі. Гісторыкі славянскай культуры даўно знаёмы з такімі помнікамі мінуўшчыны, як каменныя фігуры жанчын–родапачынальніцў, жанчын–рожаніц.

Дэманалогія беларускага Купалля. Нарматыўна-прававое поле паводзін у перыяд ад Купалля да Пятра.

Узвіжанне – каляндарная мяжа замыкання хтанічнага свету. Абрадавыя абмежаванні ў сістэме паводзін. Міфапаэтычны комплекс уяўленняў пра Цара вужоў, легенды і паданні пра вы-Рай. Сімволіка абрадавых дзеянняў на Юр’я (выпускае хтанічных істот) і Узвіжання (закрывае хтанічных істот).У народным асяроддзі этымалогія назвы свята стала даволі празрыстай і грунтуецца на бытавым апрадмечванні адпаведных сялянскіх работ, перш за ўсё перавозцы жыта ў гумно. Рускае «Воздвиженье» (крыжа) у моўнай стыхіі беларусаў трансфармавалася–калькіравалася ў не зусім выразнае «Узвіжанне» са значэннем руху, перамяшчэння. Адсюль сялянскае падсумаванне–разважанне: *«К Здзвіжанню ўсё павінна быць здзвінута»* — звезены з палёў у гумно снапы азімых і яравых культур, выбрана бульба, рассцелены для сушкі лён–даўгунец, пачыналася ўборка капусты, збіранне журавін. Селянін спяшаўся з заканчэннем работ, таму што канец верасня нёс з сабой вялікія змены ў стане прыроды. Практычна гэта быў час першых зазімкаў. «На Узвіжанне халат з плеч, а кажух на плечы», — казалі ў народзе.

Усё жывое таксама рыхтавалася сустракаць зіму. Адляталі ў вырай птушкі, лічылася, што першай збіралася ў дарогу зязюля, а апошняй — шэрая галка. У сувязі з гэтым яе велічалі ключніцай, бо яна як бы замыкала лета і забірала з сабой ключы ажно да будучага веснавога Юр'я. Беларускія народныя легенды данеслі да нас яшчэ адну адзнаку ўзвіжаньскага дня. У іх шырока бытуе матыў: «Ва Узвіжання пару гадзюкі і вужы хаваюцца ў нару».

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Як вы разумееце паняцце “анімізм”?
2. Як вы разумееце паняцце “татэнізма”?
3. Як вы разумееце паняцце “фецішызм”?
4. Як вы разумееце паняцце “дэманалагія”?
5. Хто такія русалка, хлеўнік, дамавік, лесавік і інш.

**Літаратура:**

*Беларуская міфалогія :* энцыкл. слоўнік / рэдкал.: С. Санько (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск : Беларусь, 2006. – 599 с.

*Вуглік, І. Р.* Міфалогія беларусаў : навуч.-метадыч. дапаможнік / І. Р. Вуглік. – Мінск : Сучасныя веды, 2005. – 151 с.

*Гуд, П. А.* Беларускі купальскі комплекс і семантыка абрадавых дзей / П. А. Гуд. – Мінск : Тэхнапрынт, 1999. – 221 с.

*Калачова, І. І.* Народныя традыцыі і звычаі выхавання: этнапедагагічная спадчына этнасаў Беларусі / І.І.Калачова. – Мінск: Беларусь, 1999. – 179 с.

*Коваль, У. І.* Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы: даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі / У.І. Коваль. – Гомель, 1995. – 180 с.

*Ненадавец,* А. М. Міфалогія роднага краю / А. М. Ненадавец. – Мінск : Беларусь, 2018. – 399 с.

*Новак,* В. С. Міфалогія беларусаў / В. С. Новак. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2005. – 252 с.

*Шамякіна,* Т. І. Міфалогія Беларусі: нарысы: вучэб. дапаможнік / Т. І. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 399 с.

### *Тэма 5. Традыцыі навалецця ў міфарытуальных практыках беларусаў*

Каляндарная прымеркаванасць пачатку Новага года ў перыяд ад зімовага сонцастаяння да веснавога раўнадзенства. Характарыстыка часу ў міфалагічных вераваннях. Этнаграфічныя апісанні абрадаў і свят, тэксты валачобных песень і нашы ўласныя палявыя матэрыялы пераканаўча сведчаць, што ўніверсальна-абагульняючага календара, які б факусіраваў у сабе абсалютна ўсе рытуальна-абрадавыя комплексы, сярод беларусаў не існуе. Разам з тым любы соцыум, які мае свой сакральны каляндар як праяўленне канкрэтнай лакальна-рэгіянальнай традыцыі, меў тое свята, якое вызначала антрапакасмічную мяжу паміж завяршэннем аднаго каляндарнага года і пачаткам наступнага. Абрад навалецця з'яўляецца тым святочным комплексам, які не толькі факусіраваў у сабе ідэю абнаўлення свету, але і раскрываў універсальную мадэль дзейнасці чалавека, максімальна набліжаную да касмаганічнай дзейнасці міфалагічных багоў. «Кожны Новы год, – адзначае М. Эліядэ, – аднаўляе касмагонію, зноў ствараецца Свет, пры гэтым "аднаўляецца" і Час, ён рэгенерыруецца тым, што людзі "пачынаюць спачатку". А касмаганічны міф служыць узорам для ўсялякага "аднаўлення" і "пабудовы"… Паўтараючы ў абрадах акт тварэння, людзі аднаўляюць першасную карціну свету».

Рытуальна-абрадавы комплекс Калядаў – сімвалічная мяжа паміж старым і новым годам. Міфалагічныя аспекты касмізацыі хаосу. Гурт калядоўшчыкаў – сімвалічнае ўвасабленне пантэону вярхоўных багоў. Ваджэнне "казы" як ушанаванне бога Сонца. Калядныя кастры. Беларуская, духоўная традыцыя абапіралася на феномен цыклічнасці каляндарнага часу даўжынёй у сонечны год. Таму кропкай адліку навалецця маглі быць час нараджэння свяціла або яго канчатковай перамогі над ноччу. Час актуалізацыі абодвух святочна-абрадавых комплексаў суадносіўся з гэтымі прынцыпова важнымі касмічнымі падзеямі.

Яшчэ ў XIX ст. пачатак святкавання *Калядаў* прыпадаў на дзень зімовага сонцавароту – ноч з 24 на 25 снежня. Свята доўжылася два тыдні, а эпіцэнтрам калядных падзей была сустрэча Новага года, якой адпавядала другая куцця з сімвалічнай для навалецця назвай – *Шчадрэц, Багатуха*. Дзякуючы грамадска-палітычнай сітуацыі пачатку XX ст. рытуальна-абрадавы комплекс *Каляды* перацярпеў значную трансфармацыю: з пераходам дзяржаўнага летазлічэння на грыгарыянскі стыль межы калядных падзей для праваслаўных беларусаў былі перанесены на перыяд з 6 па 21 студзеня. Такім чынам стрыжнёвыя падзеі гэтага рытуальна-абрадавага комплексу аказаліся па-за межамі адвечнай касмічнай суаднесенасці, а *Шчадрэц* стаў вядомы сучаснікам як святкаванне Старога Новага года. Разам з тым для соцыуму, які займаўся аграрнай дзейнасцю, было абсалютна заканамерным святкаваць навалецце, калі абуджаліся апладняльныя сілы прыроды, калі «шлюб» паміж нябесным Сварогам і благаславеннай Маці-Зямлёй павінен быў напоўніць усё жывое новай жыццядайнай энергіяй і закласці асновы новага ўраджаю. Можна небеспадстаўна сцвярджаць, што яшчэ ў эпоху Сярэднявечча плямёны, якія ўдзельнічалі ў этнагенезе беларусаў, у дзень веснавога раўнадзенства адзначалі *«Вялікі дзень»* (калі працягласць светлавой часткі сутак становіцца большай за ноч)

Камаедзіца: абрад “Разбудзіць мядзведзя” як зварот да татэмных першапродкаў аб распачынанні новага цыкла жыцця. Свята ў гонар мядзведзя. Бадай што найбольш значнае месца ў старажытных вераваннях і міфалагічных уяўленнях усходнеславянскіх народаў займаў мядзведзь. Як сведчаць археалагічныя дадзеныя культ мядзведзя быў распаўсюджаны ў цэнтральнай і паўночнай частках Беларусі. Вялікі посуд у выглядзе мядзвежай галавы быў знойдзены падчас раскопак Благавешчанскай гары ў Бранскай вобласці. Прычым сакральная выява аказалася побач з цэнтральным ідалам багіні. Чэрап вялікага мядзведзя знойдзены і на Сяцілішчы ў Смаленскай вобласці. Вобраз мядзведзя ў вусна-паэтычнай спадчыне славян. У старажытныя часы паляванне на мядзведзя было забаронена. Святасць у адносінах да гэтай жывёлы таксама забараняла ўжываць яго мяса і шыць адзенне з яго скуры. Татэмістычны культ не дапускаў і проста ўзгадваць мядзведзя ў звычайнай размове. Лічылася, што гэта моцная і грозная жывёліна імгненна адзавецца і з’явіцца побач. Таму ў гутарковай мове ўладара мясцовых лясоў часцей за ўсё называлі такімі словамі: «сам», «гаспадар», «дзядуля», «млынар», «лешы», «касматы», «аўсяннік», «бортнік», «касалапы». Ды і сама назва “мядзведзь” узнікла з-за той самай падмены слоў, якія яго характарызуюць: вядзьмед – ведае, дзе мёд. Больш старажытная назва гэтай жывёлы “бэр” (і сёння яго “месца жыхарства” завецца бярлогай, ці “логавам бэра”). Дарэчы, у Лельчыцкім раёне месца, дзе гадуецца вялікі кабан, называюць “бярлог”, а самога кабана празвалі боравам.

Нельга пакінуць па-за ўвагай адзін нюанс старажытнага календара нашых продкаў. Выпадковасць гэта, элементарны збег абставін ці нейкая неспазнаная заканамернасць, аднак побач па часе выканання аказаліся два вельмі значныя святы (безумоўна, розныя па часе ўзнікнення і зместу рытуальных дзеянняў), у назве якіх адлюстравана асноўная святочная страва – Масленіца (масла) і Камаедзіца (есці камы). Адказ паспрабуем пашукаць у тым даволі лапідарным апісанні, якое пакінуў С. Нячаеў. Аўтар адзначае, што ў гэты дзень рыхтуецца асобая ежа. На першую страву гатуецца сушаны рэпнік як у знак таго, што мядзведзь ужывае пераважна раслінную ежу. На другую страву падаецца кісель, таму што мядзведзь любіць авёс. А вось месца трэцяй рытуальнай стравы займала гарохавая каша, якая разварвалася або ўправала так, што калі яе падавалі на стол, то яна была ў выглядзе камоў (камкоў, камякоў). Менавіта каша і стала асновай для ўзнікнення назвы абраду – "есці камы" - і свята, падчас якога ён выконваўся. Абрад "Разбудзіць мядзведзя" – распачаць навалецце.

Велікодны рытуальна-абрадавы комплекс у кантэксце традыцый сустрэчы Новага года. Валачобныя песні – сімвалічнае ўвасабленне сакральнага календара беларусаў. Нябесны пантэон у кантэксце гадавога цыкла земляробчага календара. Чырвонае яйка – сімвал згорнутага часу ў абрадах навалецця. На Вялікдзень яйкі свянцілі ў царкве, і затым на працягу трох дзён яны суправаджалі літаральна кожны крок селяніна. З яго пачыналі святочную трапезу, клалі ў посуд з вадой, якой умывалася ўся сям'я, каб быць здаровымі і прыгожымі; яйкі давалі гасцям або бралі з сабой, калі ішлі ў госці, імі дзяўчаты адорвалі хлопцаў, з якімі меліся браць шлюб. Дзеці і моладзь гулялі ў біткі, на высахлых пагорках качалі з латкоў. Шалупінне велікодных яек змешвалі з зернем ячменю, аўса, пшаніцы перад пасевам. Яйка было сярод рытуальных страў, якія брала з сабой гаспадыня, калі збіралася на могілкі на Радаўніцу. На кожнай прыбранай магіле продкаў качалі яйкі, робячы крыж, а невялічкія кавалачкі іх пакідалі для сілкавання душ продкаў, якія ў гэты дзень зляталіся на могілкі, каб паглядзець, як ідуць справы ў іх нашчадкаў.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Вызначце прыродазнаучую абумоўленасць сустрэчы Новага календарнага года?
2. Параўнайце асноўныя складовыя сустрэчы новага года у Беларусі і Кітаї?
3. Вызначце гістарычную абумоўленасць сустрэчы Новага календарнага года?
4. Якія святы беларускага народнага календара адпавядалі сустрэчы новага года?
5. Пералічыце асноўныя абрады навалецця?

**Літаратура:**

*Жыцця* адвечны лад. Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Мастац. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.

*Земляробчы* каляндар: абрады і звычаі / Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; [рэд. кал.: В. К. Бандарчык, К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік (гал. рэд.) ; уклад., класіфікацыя, сіст. матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.
*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 1. – 359 с.
*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 2. – 413 с.
*Катовіч, А.* Зімовыя святы : навук.-папуляр. выд. / А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск : Мастац. літ., 2004. – 119 с.
*Катовіч, А.* Летнія святы : навук. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – Кн. 1. – 368 с.

### *Тэма 6. Ушанаванне першаэлементаў славянскай касмагоніі ў структуры народнага календара: апазіцыі “Неба – Зямля”, “вада – агонь”*

Міфалагічныя ўяўленні аб архетыпе зямлі. Дыхатамія “Неба – Зямля” ў касмаганічных уяўленнях беларусаў. Легенды і паданні аб ўтварэнні зямлі. Сімвалізацыя зямлі ў міфапаэтычнай спадчыне (Маці-сырая зямля, Маці-карміцелька). Сістэма этыкетна-нарматыўных рэгламентацый у дачыненні да зямлі.

Ушанаванне Зямлі ў каляндарных абрадавых практык. Масленічныя катанні з гор, абрады гукання вясны, Саракі; “асвячэнне” і рытуальнае ўключэнне сельскагаспадарчых прыладаў працы ў навалетні цыкл гаспадарання. Комплекс гаспадарчых і земляробчых рэгламентацый і забарон у прасторы святкавання Благавешчання. Комплекс міфалагічных уяўленняў, звязаных з веснавым адмыканнем зямлі на Юр’е. Першы веснавы гром. Імяніны зямлі ў маі. Ушанаванне зямлі ў рытуальна-абрадавым комплексе “Тройца – Зялёныя святкі”. Сістэма гаспадарчых забаронаў, перасцярог, прадпісанняў на перыяд з Купалля і да дня ўшанавання Пятра і Паўла.

Абрады заканчэння жніва: завіванне барады, падзяка і ахвяра Маці-зямлі. Шмат у якіх мясцінах Беларусі заключны этап жніва называецца «завіванне барады». Абрад гэты выконваецца наступным чынам. Заканчваючы жытняе жніво, адны жнеі зразаюць жменю каласоў і завіваюць вянок, аздоблены палявымі кветамі. Другія жнеі тым часам пакідаюць некалькі каласоў, садзяцца на раскладзеныя побач снапы і пачынаюць палоць траву пад кустом. Калі ўсё гатова, палольніца вырывае адну сцябліну і перавязвае ў пучок увесь куст ля самых каласоў. У сярэдзіну завітай «барады» кладуць акраец аржанога хлеба з

соллю. Пасля гэтага жанкі складваюць у апошнюю бабку снапы, ускладваюць вянок на галаву палольніцы і з песнямі адпраўляюцца дадому.

Шматэтапнае восеньскае замыканне зямлі: аграрна-прадуцыравальныя аспекты свята Багач; міфалагічны комплекс уяўленняў свята Ўзвіжанне; Пакровы: сімвалізм завяршэння цыкла земляробчых работ; Восеньскія Дзяды – заключны этап замыкання зямлі на зімовы спачын.

Апазіцыя "вада – агонь" як процістаянне нябеснага і зямнога пачаткаў у касмаганічных міфах беларусаў. Стыхія вады як ўвасабленне хаосу, жаночага пачатку, асновы для ўтварэння зямлі. Уяўленні беларусаў аб міфалагічным статусе першага дажджу, першага снегу. Нарматыўна-прававое поле кантактаў чалавека са стыхіяй вады ў каляндарным колазвароце: хрышчэнская вада, "купанне ў Іардане", купанне ў чысты чацвер, качанне па расе на Юр'е, забарона купацца на Русальным тыдні, у купальскую ноч, пасля Іллі Грамавержца.

Ушанаванне свяшчэннага агню: Грамнічная свяча як абярэг хатняй гаспадаркі ад перуновых стрэл у час навальніцы. Грамнічная свечка – абярэг чалавека і яго жытла. Як дзяўчына павінна была выткаць сабе на вяселле ручнік, на якім будзе стаяць у храме пад час вянчання, так грамнічную свечку кожны гаспадар рыхтаваў самастойна. У гэтым не дужа складаным і не такім ўжо адказным, як можа падацца на першы погляд, перадсвяточным дзеянні на самай справе была закладзена класічная для традыцыйнай культуры ідэя самазахавання. Усе забудовы, узведзеныя рукамі гаспадара, трэба было абараніць ад варожай сілы агнём той свечкі, якая ў адпаведны дзень будзе зроблена рукамі ўсё таго ж чалавека-гаспадара.

Воск для *Грамніц* збіралі загадзя, а выраблялі іх у апошнюю перад святам суботу, якая з даўніх часоў была днём ушанавання памёршых продкаў. Абрадавая свечка-*грамніца* станавілася тым сакральна магічным атрыбутам, у якім ў адзінае цэлае зліваліся тры складовыя часткі: *нябесны агонь* (як сімвал сонца, якое даруе жыццё на зямлі) – *культ продкаў* (як знак уключанасці ў структуру радаводнага дрэва, як повязь паміж продкамі і жывымі) - і тое *пакаленне людзей*, якое на гэты час падхапіла эстафету роду і гаворыць з ім моваю добра вядомых і зразумелых сімвалаў.

Ушанаванне дрэў, у якія трапіла "перунова страла". Сімвалізм першага веснавога грому. Святы агонь праваслаўнай Пасхі. Ушанаванне агню ў юраўскай абраднасці. Абрад "Ваджэнне стралы" – захавання вёскі і пасеваў ад засухі і пяруновых стрэл. Беларускае Купалле як сінтэз касмічных стыхій агню і вады. Купальскае вогнішча – сімвал росквіту Сонца.

Культ агню ў памінальнай абраднасці беларусаў. Палесскі абрад "Жаніцьба коміна" як сімвал перанясення агню ў прастору сялянскага жылля.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Як вы разумееце паняцце "першаэлемент"?

2. Як вы разумееце паняцце “касмагонія”?
3. Як вы разумееце паняцце “апазіцыя”?
4. Прывядзіце назвы свят беларускага народнага календара, якія адпавядаюцб апазіцыі “Неба – Зямля”?
5. Прывядзіце назвы свят беларускага народнага календара, якія адпавядаюцб апазіцыі “вада – агонь”?

**Літаратура:**

*Агапкина,* Т. А. Мифопоэтические основы славянского народного календаря. Весенне-летний цикл / Т. А. Агапкина. – М. : Индрик, 2002. – 816 с.

*Жыцця* адвечны лад. Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Мастац. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.

*Земляробчы* каляндар: абрады і звычаі / Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; [рэд. кал.: В. К. Бандарчык, К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік (гал. рэд.) ; уклад., класіфікацыя, сіст. матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 1. – 359 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 2. – 413 с.

*Катовіч, А.* Зімовыя святы : навук.-папуляр. выд. / А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск : Мастац. літ., 2004. – 119 с.

*Катовіч, А.* Летнія святы : навук. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – Кн. 1. – 368 с.

*Шамякіна,* Т. І. Міфалогія Беларусі: нарысы: вучэб. дапаможнік / Т. І. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 399 с.

## *Тэма 7. Аброчная традыцыя ў сістэме каляндарных абрадаў беларусаў*

У асяроддзі беларусаў шырока бытавала і захавалася да нашага часу яшчэ адна форма аказіянальнага абраду – традыцыя абракання. Т. А. Бернштам сведчыць, што каля вытокаў народных «покоянных обетов» стаіць знакаміты феномен «исповедь земле» – адна з пераважных форм калектыўнага хрысціянскага аброку ў Сярэднявеччы, якая зводзілася да будаўніцтва храма або капліцы ў гонар якога-небудзь святога, каб заручыцца яго дапамогай перад стыхійнымі бедствамі. Аброк, зарок, запавет – добраахвотнае рашэнне чалавека або абшчыны прынесці ахвяру Богу ў нейкай экстрэмальнай сітуацыі, прычым гэтае рашэнне магло мець індывідуальны, сямейны, родавы або супольны характар. Прычынай актуалізацыі практыкі абракання маглі стаць тыя ж самыя фактары: цяжкая хвароба, непрадказальная бяда, працяглая засуха, эпідэмія,

пагроза варожага нападу, згуба кагосьці з членаў сям'і, ад'езд у далёкі край на працу, цяжкая хвароба дзіцяці або калі ў сям'і доўгі час не з'яўлялася дзіця.

Міфасемантычныя і сацыянарматыўныя аспекты традыцыі абракання. Формы і структура абракальных абрадаў. Зместавыя аспекты абрадаў абракання: захаванне дабрабыту, калізіі сямейнага жыцця, лёс чалавека, удзел у вайне, самагубства каго-небудзь з членаў сям'і. Індывідуальныя, сямейныя, родавыя, агульнавясковыя абракальныя традыцыі; мужчынская і жаночая аброчныя традыцыі. Узаемасувязь традыцыі абракання з днямі ўшанавання хрысціянскіх святых. Рэгіянальныя асаблівасці абракальных абрадаў. Знітаванасць традыцыі абракання з локусамі сакральнай геаграфіі беларусаў: святыя крыніцы, свяшчэнныя дрэвы, камяні-крыжы і камяні-следавікі.

Важнай складовай традыцыі абракання было ахвярапрынашэнне ў выглядзе свечкі, рытуальнай ежы (бліны, каша). Аднак часцей за ўсё ў абракальным кантэксце з'яўлялася ўсё тое ж палатно, ручнік, а таксама грошы. Каб пазбавіцца ад хвароб, часткай ахвярапрынашэння станавілася асабістае адзенне, якое павязвалі на дрэвы побач з аброчным крыжам.

Этнаграфічныя крыніцы і нашы ўласныя запісы сведчаць, што традыцыя абракання цалкам уваходзіць у цыкл аказіянальных абрадаў. Аднак існуе адна акалічнасць, якая ў значнай ступені яго ўскладняе, – межы часавага перыяду. Звычайна аброк даваўся чалавекам на той тэрмін, які ён вызначаў самастойна: месяц, год і нават на ўсё жыццё. Абраканне тэрмінам у месяц – гэта фактычна тая ж закальцаванасць часу, толькі ў аснову пакладзена іерафанія Месяца. Пажыццёвае абраканне ўтрымлівала ў сабе ўсё той жа, але больш ускладнены варыянт каляндарнай аказіянальнасці. Справа ў тым, што людзі, якія абракаліся на ўсё жыццё, павінны былі штогод, прычым у адзін і той жа дзень (хутчэй за ўсё звязаны з днём ушанавання якога-небудзь хрысціянскага святога) паўтараць (абнаўляць або аднаўляць, замацоўваць) распачаты імі калісьці абрад самазахавання.

Традыцыя абракання праяўляецца праз ушанаванне аброчнай свечкі. Абрад адрозніваецца сваёй непаўторнасцю, праяўленасцю шматлікіх дэталяў, жорсткімі правіламі, якія выконваюцца няўхільна. Напрыклад, у абрадзе «Гуляць у свячу», які адбываецца ў в. Басценавічы Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці штогод 18–19 снежня, прымаюць удзел толькі жанчыны. Аброчная свяча ў гонар св. Міколы (в. Чарапы, Шклоўскі раён Магілёўскай вобласці) ушаноўваецца 20–21 снежня і гуртуе вакол сабе сем'і аднавяскоўцаў. Ушанаванне свячы ў гонар святых Пятра і Паўла (в. Наркі, Чэрыкаўскі раён Магілёўскай вобласці) цесна знітавана з пакланеннем святой крыніцы «Брязгун», якое адбываецца 12 ліпеня.

У суседняй Бранскай вобласці формай аброку выступала выпяканне рытуальнага хлеба. Падчас вайны ў вёсцы па ўсіх дварах збіралі патроху мукі,

пасля набажэнства ўдовы выпякалі з гэтай мукі тры караваі, адзін з іх дзялілі на маленькія кавалачкі і раздавалі ўсім, хто даваў муку, а два астатнія неслі ў суседнюю вёску. Там дзеянні паўтараліся. Выконваючы гэты абрад, людзі былі ўпэўнены, што як толькі выпечаны хлеб дасягне лініі фронту, вайна скончыцца.

Мікольская братчына і аброчная свечка. “Мікольшчына” – Мікольская братчына і аброчная свечка – сімвалы беларускай талакі. У цэлым шэрагу вёсак Гомельшчыны на Мікольшчыну, гэтаксама як і на Ушэсце, рабілі аброчную свечку. Аналагічныя праяўленні культу Мікалая адзначаны на Смаленшчыне і ва Украіне. Гаспадыні накрывалі святочны стол, за якім збіраўся цэлы гурт людзей; абавязковай стравай быў мёд, які з адной місы каштавалі ўсе. Затым з сотавага воску рабілі вялікую свечку і запальвалі яе перад абразам святога Мікалая. Петрапаўлаўская аброчная традыцыя (“Брязгун”); Пакроўская свяча.

Абракальная традыцыя на Ўшэсце, сувязь з абрадам “Ваджэнне і пахаванне Стралы (“Вынас свечкі”). “Бяду (стралу) у поле адвяду” – абрад захавання вёскі ад Пяруна. Лакальныя варыянты абраду “Пахаванне стралы”. Абрад “Хрэн”. Сімволіка “стралы” як рытуальнага атрыбута. Абрад “Вынас свечкі”. Аброчная свечка. Варажба або зварот да продкаў. Засцерагальная функцыя “маладога жыта”. Ваджэнне карагодаў – спецыфічная з’ява веснавога цыкла святаў беларускага народнага календара. Абрадавыя карагоды.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Як вы разумееце паняцце “абракацца”?
2. Як вы разумееце паняцце “аказіянальны абрад”?
3. Як вы разумееце міфасемантычныя і сацыянарматыўныя аспекты традыцыі абракання?
4. Як вы разумееце зместавыя аспекты абрадаў абракання?
5. Аброчная свечка – умовы прыгатавання і выкарыстання?
6. Прывядзіце прыклады існавання лакальных традыцый абракання?

**Літаратура:**

1. *Катовіч,* А. В. Катовіч, А. В. Мікольская “Свяча” – феномен абрадавай практыкі беларусаў (в. Чарапы Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці) / Аксана Катовіч, Янка Крук. – Мінск : Інбелкульт, 2013. – 93 с.
2. *Катовіч,* А. В. Веснавыя святы : у 2 кн. / А. В. Катовіч, І. І. Крук. – Кн. 1. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 359 с.
3. *Катовіч,* А. В. Веснавыя святы : у 2 кн. / А. В. Катовіч, І. І. Крук. – Кн. 2. – Мінск : Маст. літ., 2005. – 413 с.

*Тэма 8. Беларускі карнавал: маскі і маскаванне, пераапрананне*

Беларускі карнавал у кантэксце еўрапейскіх містэрыяльных традыцый.

*Карнавал* – пашыранае ў асноўным у каталіцкіх краінах свята, звязанае з *перапрананнямі, маскарадамі маляўнічымі шэсцямі.* Адзначаецца перад Вялікім постам. Аналогія ўсходнеславянскай Масленіцы. Суправаджаўся масавымі народнымі гуляннямі. Першыя карнавалы ў Італіі (*Венецыянскі карнавал*), дзе раней за ўсё з'явіліся вялікія незалежныя гарады. Карнавалы ў Францыі і Германіі. Першая палова карнавала была звязана з выкананнем пэўных царкоўных рытуалаў, другую, неафіцыйную палову святазвычайна складалі народна-святочныя формы. У XVIII – XIX стст. яны падзяліліся, і карнавал стаў існаваць як адзін з відаў масавых відовішчаў.

Прасторава-часавы кантынуум беларускіх карнавалаў: абрадавае мадэляванне будучыні. Антысвет карнавальных відовішчаў. Беларуская даследчыца Т. І. Кухаронак, якая ўсебакова разгледзела ролю і месца маскіравання, слушна заўважыла: «Маскіраванне і абрадавае пераапраненне … належыць да ўнікальных з'яў традыцыйнай святочна-абрадавай культуры беларусаў. Іх вывучэнне адкрывае нам яшчэ адну грань светаўспрымання нашых продкаў, дапамагае ўбачыць шматлікія сувязі, што аб'ядноўвалі ў мінулым рэальнае жыццё людзей з міфічным светам». Даследчыца традыцыі маскіравання ў рускай абрадавай культуры Л. М. Іўлева больш дакладна вырашае праблему абрадавых стасункаў сакральнага і прафаннага: «Прадметам яго выяўлення была пазачасавая "рэчаіснасць" міфалагічных, у тым ліку і касмалагічных, уяўленняў, а не зменлівая і рухомая рэчаіснасць побыту і гісторыі».

Сімволіка тэатралізаваных відовішчаў. Міфасемантычныя аспекты карнавальных традыцый. Пераапрананне як унікальная з'ява беларускай святочна-абрадавай культуры. Сімволіка-міфалагічная (салярная), магічная (карпаганічная, апатрапеічная), татэмістычная версіі паходжання карнавалаў. Галоўныя персанажы карнавальных відовішчаў: міфічныя багі, антрапаморфныя і зааморфныя постаці. Інверсійныя формы каляндарных відовішчаў: трансфармацыя мужчынскага і жаночага пачаткаў. Пераапрананне як спецыфічны тып гульні. Сімвалізм адзення і рэчаў. Эратычны свет народна-карнавалізаванай культуры.Карнавальныя пераапрананні і маскаванне. Карнавальныя маскі: тэхналогіі вырабу, працэсуальны кантынуум, рэчыўны свет. Карнавальны свет каляндарных абрадаў.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Як вы разумееце паняцце "карнавал"?
2. Як вы разумееце паняцце "маскарад"?
3. З якой мэтай неабходна было хаваць свае твары пад час выканання абрадў календарнага цыкла?
4. Назавіце галоўных персанажаў карнавальных відовішчаў?
5. У якіх святах беларускага народнага календара прысутнічаў карнавал і маскарад?

**Літаратура:**

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 1. – 359 с.

*Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры : навук. выд. / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2011. – 430 с.

*Кухаронак,* Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск: Ураджай, 2001. – 239 с.

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс]: учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856.

*Народны* тэатр / уклад. М.А. Каладзінскі. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 554с.

*Тэма 9. Гульня як абавязковая частка беларускай святочнай культуры*

Увесь комплекс міфапаэтычнай і міфарытуальнай спадчыны беларускага народа самым непасрэдным чынам звязаны з працэсам актуалізацыі традыцыйных народных свят і абрадаў: рытуальна-абрадавыя практыкі, міфы, культы, сакральна-магічныя дзеянні, вераванні, рэлігійныя ўяўленні, атрыбутыўная кампанента, народная харэаграфія, і, безумоўна, абрадавыя гульні, традыцыя пераапранання і маскавання.

Тэорыя Хёйзенгі аб станаўленні культуры на аснове гульні. Міфалагічная аснова святочных гульняў беларусаў. Класіфікацыя каляндарных, сямейна-родавых і пазаабрадавых гульняў. Гульні ў кантэксце каляндарных святкаванняў беларусаў. Эратычны аспект гульнёвых традыцый моладзі перадшлюбнага ўзросту. Абрадавыя гульні ў кантэксце вясельных абрадаў. Сацыялізацыя падлеткаў як спецыяльная тэма каляндарных святкаванняў.

Традыцыйныя зімовыя ігрышчы беларусаў: генезіс і тэндэнцыі развіцця зімовага гульнёвага комплексу. Калядныя гульні ў закрытым памяшканні. Тэатралізаваныя калядныя гульні (“Жаніцьба Цярэшкі”, “Яшчар”, “Жаніцьба Бахара”). Калядныя гульні на адчыненай прасторы (“Цягнуць каляду на дуба”, “Кола”, “Конікі”, “Слуп”, перацягванне канатаў).

Абрад-гульня *“Масленічныя калодкі”*. Штогадовае рэгуляванне адносін у межах вясковай абшчыны мела двухбаковую накіраванасць. У адным выпадку людзі выказвалі падзяку за разуменне неабходнасці своечасовага ўключэння ў склад захавальнікаў і прадаўжальнікаў роду, а ў другім – той, хто па нейкіх абставінах пакуль што (на момант выканання абрадавай дзеі) не абраў шлюб, прымусова падвяргаліся публічнаму пакаранню (зразумела, не фізічнаму, а

жартоўна-сімвалічнаму, але ад гэтага не менш выніковага). Той жа гурт жанчын наведваў хаты і тых гаспадароў, у якіх гадаваліся хлопцы-перарасткі і прывязваў да нагі апошніх невялікую драўляную калодку. Яе сімволіка была шматзначнай. Найбольш архаічнае значэнне зводзілася да актуалізацыі эратычнай сімволікі: "колодка" (палка, шостка) была незавуаліраваным увасабленнем фалічнага культа. Публічныя прэтэнзіі жанчын абапіраліся на старажытныя, яшчэ праславянскія грамадскія рэгулятывы. Чалавек прыйшоў у гэты свет, каб аднавіць ланцужок жыцця на новым этапе родавай эстафеты. Калі хлопец або дзяўчына дасягалі ўзросту фізіялагічнай саспеласці, род немінуючага ўскладваў на іх пачэсны грамадскі абавязак, абумоўлены прыроднай наканаванасцю прадоўжыць род. У больш позні часы ролю гэтага абрадавага атрыбута выконвалі розныя прадметы: кавалак *чырвонага паса, стужка, смаліна, а часам нават і салёная сялёдка* (у якасці атрыбута публічнага пакарання маглі быць скарыстаны *лялькі* драўляныя або выраблены з тканіны, *абаранкі*, аздобленыя папяровымі рознакаляровымі стужкамі або кветкамі, расквечанымі папяровымі стужкамі *бутэлька*, размаістая *хусціна* або звычайны *бурак*). "Калодку" чаплялі хлопцам да нагі або, калі гэта была стужка, маглі павязаць на шыю. Знак абрадавага пакарання хлопцы-перарасткі павінны былі насіць увесь масленічны тыдзень. Аднак калі хлопец лічыў пакаранне неапраўданым, ён мог "адкупіцца" ад сваіх аднавяскоўцаў добрым падарункам або пачастункам.

Абрадавыя і пазаабрадавыя гульні веснавых свят народнага календара. Земляробчы-магічны накіраванасць абрадавых веснавых гульняў (качанне на арэлях, валачэнне калодкі, качанне яек, "біткі". Вучоныя мяркуюць, што апошняя гульня мела старажытнае паходжанне: яйка, скаціўшыся з латка і датыкнуўшыся да зямлі, павінна было апладніць яе, разбудзіць да новага жыцця.

Антрапаморфныя (баба, дзед) і зааморфныя персанажы абрадавых веснавых гульняў: птушкі, тур. "Тураўскі карагод" – юраўскае ігрышча моладзі. "Ваджэнне і пахаванне Стралы" – сакральна-магічны гульнёвы карагод на перасцярогу вёскі ад Перуна. У вёсках Веткаўскага раёна на Ўшэсце выконваецца абрад "Ваджэнне і пахаванне стралы", міфасемантычная сімволіка якога зводзіцца да замыкання вёскі на перыяд летніх навальніц.

Гульнёвыя традыцыі беларускага Купалля. Варожбы на зеляніне, жытніх каласах. Шлюбная накіраванасць тэатралізаваных купальскіх гульняў. Гульнёва-песенныя спаборніцтвы рознаполых груп. Вогненныя ігрышчы (выбар пары, перакідванне вянкоў, варожбы з вянкамі, скокі праз вогнішча, качанне запаленага кола, шуканне папараць-кветкі). Карнавальныя купальскія пераапрананні і начныя абходы вёскі: пераварочванне калёсаў, перанясенне лавак, раскідванне паляніц).

Гульнявыя элементы ў структуры восеньскіх святкаванняў. Карнавалізаваны карагод "Жніўны вянок". Жніўныя варожбы і вераванні моладзі

перадшлюбнага ўзросту падчас свята дажынак. Гульні і варожбы шлюбнай накіраванасці свята Пакровы.

Развіццё гульнёва-забаўляльных праграм на сучасным этапе адбываецца ў двух накірунках: з аднаго боку, захаванне традыцыйных гульнёвых формаў, з другога – распрацоўка новых гульнёвых формаўтварэнняў, пабудаваных на аснове мастацка-гістарычнай спадчыны.

Класіфікацыя праграм па змесце, узросце, месцы правядзення і г.д.

Каляндарна-абрадавыя (у адпаведнасці са святамі каляндарнага цыкла) і сямейна-бытавыя (вяселле, радзіны, юбілеі) народныя гульнёва-забаўляльныя праграмы.

Праграмы экалагічнай накіраванасці (свята лесу, свята кветак, свята птушак, свята на вадзе).

Праграмы, прымеркаваныя да свят беларускай культуры (дзень ведаў, дзень пісьменства, юбілеі памятных гістарычных падзей, свята народнай музыкі, фестываль мастацтваў, свята гумару).

Праграмы па узроставым прынцыпе (дзіцячыя, падлеткавыя, маладзёжныя); па месцы правядзення (на адкрытым паветры, у памяшканні); па сюжэтнай лініі (конкурсныя, драматычныя, творчыя, спартыўныя); па характары арганізацыі калектыву (з раздзяленнем на каманды, без раздзялення).

Літаратурныя сцэнарыі конкурсных, гульнёва-забаўляльных, фальклорных, пазнавальна-забаўляльных праграм.

## Пытанні для самаправеркі:

1. Які змест укладваецца ў каляндарна-абрадавыя народныя гульнёва-забаўляльныя праграмы.
2. Які змест укладваецца ў сямейна-бытавыя народныя гульнёва-забаўляльныя праграмы.
3. Які змест укладваецца ў праграмы экалагічнай накіраванасці.
4. Які змест укладваецца ў праграмы, прымеркаваныя да свят беларускай культуры.
5. Як падзяляюцца праграмы па узроставым прынцыпе.
6. Як падзяляюцца праграмы па месцы правядзення (на адкрытым паветры, у памяшканні).
7. Як падзяляюцца праграмы па сюжэтнай лініі.

## Літаратура:

Гульні, забавы, ігрышчы / рэдкал.: А.С.Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 534 с.

*Гусев, В.Е.* Народные игры, драмы и театр / В.Е. Гусев // Этнография восточных славян. Очерки традиционной культуры. – М.: Наука, 1987. – 458 с.

*Народны* тэатр / уклад. М.А. Каладзінскі. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 554с.

*Рябков, В. М.* Антология форм праздничной и развлекательной культуры России (первая половина XX в.) : учеб. пособие / В. М. Рябков ; Челяб. гос. акад. культуры и искусств. – Челябинск : Полиграф-Мастер, 2007. – Т. 4. – 870 с.
*Шубина, И. Б.* Драматургия и режиссура зрелища: Игра, сопровождающая жизнь : учеб.-метод. пособие / И. Б. Шубина. – Ростов н/Д : Феникс, 2006. – 288 с.

## Раздзел IV. Святочная культура: традыцыі і навацыі

### *Тэма 1. Дзяржаўныя святы і цырыманіялы. Прафесійныя святы. Гістарычныя і ваенныя святы*

Прыярытэтныя напрамкі палітыкі дзяржавы ў вобласці культурнага будаўніцтва: 1. фарміраванне гістарычнай памяці беларускай народа, захаванне яго нацыянальна-культурнай самабытнасці шляхам папулярызацыі каштоўнасцей матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны; 2. актыўнае далучэнне сучаснага пакалення моладзі да працэсаў захавання і развіцця культурнага патэнцыялу краіны з мэтай усебаковай рэалізацыі творчага патэнцыялу кожнай асобы; 3. усебаковае спрыянне захаванню нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларускай дыяспары.

Дзяржаўная праграма "Культура Беларусі" на 2021-2025 гады. Падпраграма 1 "культурная спадчына "(далей, калі не вызначана іншае, - падпраграма 1) накіравана на рашэнне наступных задач: захаванне культурнай спадчыны; забеспячэнне даступнасці, якасці і разнастайнасці паслуг, прадастаўляюцца бібліятэкамі і музеямі, выставачнымі арганізацыямі, паркамі культуры і адпачынку, заапаркамі; падтрымка развіцця культур нацыянальных меншасцяў. У рамках падпраграмы 2 " Мастацтва і творчасць "(далей, калі не вызначана іншае, - падпраграма 2) мяркуецца рашэнне наступных задача: падтрымка развіцця прафесійнага мастацтва, садзейнічанне павышэнню яго мастацкага ўзроўню, разнастайнасці і даступнасці для 3 насельніцтва, развіццё міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы мастацтва і творчасць; падтрымка развіцця кінематаграфічнай дзейнасці; забеспячэнне даступнасці, якасці і разнастайнасці паслуг, якія прадстаўляюцца клубнымі арганізацыямі і арганізацыямі культуры змешанага тыпу. Падпраграма 3 " функцыянаванне і інфраструктура сферы культуры " (далей, калі не вызначана іншае, - падпраграма 3) уключае меры, якія забяспечваюць выкананне наступных задач: удасканаленне інфраструктуры сферы культуры і забеспячэнне дзейнасці апарату Міністэрства культуры; інфарматызацыя і стварэнне нацыянальнага лічбавага кантэнту ў сферы культура. Мерапрыемствы падпраграмы 4 " Беларусы ў свеце "(далей, калі не вызначана іншае, - падпраграма 4) мяркуюць рашэнне задачы па развіццю партнёрства паміж дзяржавай і беларусамі замежжа.

Падпраграма 5 " Архівы Беларусі "(далей, калі не вызначана іншае, - падпраграма 5) накіравана на рашэнне задачы па забеспячэнню фарміравання, захавання і выкарыстання дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь як часткі інфармацыйнага рэсурсу краіны.

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры (2016): стварэнне на базе існуючых прававых інстытутаў адзінага механізму рэгулявання адносін у сферы культуры. Напрамкі праграмы: 1. Культурная спадчына; 2. Мастацтва і творчасць; 3. Функцыянаванне і інфраструктура сферы культуры; 4. Беларусы ў сусвеце; 5. Архівы Беларусі.

Дзяржаўнае свята: гістарычнае або грамадска-палітычнае значэнне для краіны, станоўчы ўплыў на развіццё дзяржаўнасці, грамадства, краіны. Спіс дзяржаўных свят Рэспублікі Беларусь. Паняцце «цырыманіял». Шэраг дзеянняў (абрадаў, цырымоній) і прамоў сімвалічнага характару, традыцыйна абавязковых у грамадскім, палітычным жыцці краіны. Параўнальны аналіз цырыманіяльных мерапрыемстваў у дзяржавах свету ў розныя гістарычныя адрэзкі часу.

Гістарычная абумоўленасць узнікнення традыцыі святкавання дзяржаўных святаў. Дзяржаўныя святы, святочныя дні, памятныя і святочныя даты вызначае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. У цяперашні час дзейнічае Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 сакавіка 1998 г. № 157 "аб дзяржаўных святах, святочных днях і памятных датах у Рэспубліцы Беларусь". У адпаведнасці з зменамі і дапаўненнямі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прынятымі на рэспубліканскім рэферэндуме 27 лютага 2022 года, дзяржаўныя і святочныя дні ўсталёўвае Усебеларускі народны сход. Дзяржаўныя святы ўсталёўваюцца ў азнаменаванне падзей, якія маюць асаблівае гістарычнае альбо грамадска-палітычнае значэнне для Рэспублікі Беларусь, якія аказалі істотны ўплыў на развіццё беларускай дзяржавы і грамадства. Святочныя дні ўстанаўліваюцца ў азнаменаванне іншых падзей, прысвечаных традыцыйным датам, ушанаванню работнікаў пэўнай прафесіі, галіны гаспадаркі або сферы дзейнасці і г. д. Памятныя даты, звязаныя з іншымі гістарычнымі падзеям.

Дамінуючая палітычная ідэалогія краіны. Разуменне гісторыі і часовай дынамікі, развіццё і станаўленне беларускага народа як адзінага грамадскага арганізма.

Гісторыя, сэнс і структура дзяржаўных свят. Кампаненты абрадава-рытуальнай часткі: вынас сцягоў, дзяржаўнай сімволікі, ганаровы караул, святочнае шэсце, парад, мітынг, ускладанне кветак да мемарыяльных месцаў і месцаў пахаванняў, цырымонія ўрачыстага адкрыцця і закрыцця свята, урадавы канцэрт, святочны салют і інш. Узбагачэнне сродкаў святочных відовішчаў і афармлення.

Дзяржаўныя святы РБ: Дзень Канстытуцыі-15 сакавіка; Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі – 2 красавіка; Дзень Перамогі – 9 траўня; Дзень

Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь-другая Нядзеля мая; Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) – 3 ліпеня; Дзень народнага адзінства – 17 верасня.

3 ліпеня ў Беларусі адзначаецца Дзень Незалежнасці. Менавіта 3 ліпеня 1944 года сіламі саюзнікаў Мінск быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Святкаванне пачынаецца з урачыстага парада, які праходзіць у цэнтры беларускай сталіцы. Пасля параду пачынаюцца масавыя народныя гулянні. На тэрыторыі ўсёй краіны праходзяць канцэрты, кірмашы, выстаўкі, а таксама разнастайныя забаўляльныя мерапрыемствы. Увечары ля стэлы «Мінск – горад-герой» гучыць яркі салют, якім і завяршаецца гэта святочное мерапрыемства.

Не менш важным для гісторыі нашай краіны з'яўляецца свята 9 мая – Дзень Перамогі. Наогул, беларусам перамога ў Вялікай Айчыннай вайне далася асабліва цяжка: Беларусі была нанесена каласальная матэрыяльная, эканамічная і культурная шкода. Вайна забрала кожнага трэцяга жыхара нашай краіны. 9 мая па ўсёй Беларусі праходзяць урачыстыя шэсці, дзе ўшаноўваюцца ветэраны. Таксама праходзяць ускладанні кветак да мемарыялаў памяці, акцыя «Бессмяротны полк», ваенна-гістарычныя рэканструкцыі, робяць вялікія святочныя кірмашы, палявыя кухні, ідуць канцэрты з абавязковым выкананнем музычных кампазіцый тых гадоў.

Штогод у другую нядзелю мая ў нашай дзяржаве адзначаецца Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь – галоўныя сімвалы дзяржавы. У 1995 былі прыняты новы герб, гімн, сцяг. Важнай з'яўляецца таксама і Канстытуцыя. Менавіта ў Канстытуцыі прапісаны правы і абавязкі кожнага грамадзяніна, а таксама выбарчая сістэма і дзяржаўны лад. Канстытуцыя – самы важны дакумент кожнай сучаснай дзяржавы. Дзень Канстытуцыі святкуюць з 1994 года 15 сакавіка.

2 красавіка адзначаецца Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі. У 1996 годзе два Прэзідэнты, выказваючы волю сваіх народаў, падпісалі Дагавор аб Саюзе нашых дзяржаў. Гэта азначала, што нашы дзяржавы ўзялі курс на глыбокую інтэграцыю, заснаваную на імкненні жыць і дзейнічаць разам на аснове сяброўства і даверу, бо нашы нацыі – брацкія, якія шмат праз што прайшлі разам.

Прафесійнае свята – сацыякультурная інтэграцыя людзей адной прафесіі або сферы дзейнасці. Каляндар прафесійных свят Рэспублікі Беларусь.

Гістарычныя і ваенныя святы як працэс аднаўлення матэрыяльнай або духоўнай культуры пэўнай гістарычнай эпохі, творчы экскурс у гісторыю.

Ваенна-патрыятычныя святы. Ваенна-патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі, накіраванае на фарміраванне патрыятычнай свядомасці, пачуцця

вернасці сваёй Айчыне, гатоўнасці да выканання задач па забеспячэнні абароны Айчыны.

Ёсць у гісторыі нашай Радзімы падзеі, якія нават па - сканчэнні дзесяцігоддзяў застануцца ў памяці людзей, а час з нарастальнай сілай падкрэслівае іх веліч. Гады ляцяць як адно імгненне, але памяць народа надзейна захоўвае падзеі дзён мінулых…

З спрадвечных часоў Беларусь была арэнай ваенных дзеянняў. Многія месцы захоўваюць памяць аб войнах, якія пракаціліся па тэрыторыі краіны. краіне захаваліся замкі і храмы, якія трымалі абарону; у гонар знамянальных бітваў узведзены помнікі і стэлы; у музеях краіны сабраны багатыя калекцыі ваеннай гісторыі; арганізуемыя шматлікія экскурсіі дазваляюць наведаць палі былых бітваў, якія адбываліся ў розныя перыяды на тэрыторыі Беларусі.

Існуе шмат спосабаў захаваць гістарычную памяць: фільмы, музейныя выставы, экскурсіі, аб'яднаныя тэмай вайны. Але яны не даюць прачуць падзеі так, як гістарычная рэканструкцыя і ваенна - гістарычныя фестывалі. Яны дапамагаюць ацаніць рэальны маштаб падзей.

Адной з галоўных задач пры арганізацыі ваенна-гістарычных фестываляў і рэканструкцый з'яўляецца экскурс у гісторыю. Гэта - не толькі яркае відовішча, якое прываблівае гістарычнымі касцюмамі розных эпох і піратэхнікай, гэта - важны элемент абуджэння грамадскай цікавасці да ваеннай гісторыі сваёй краіны, гонару за подзвігі продкаў.

У Беларусі дзейнічаюць клубы, якія займаюцца рэканструкцыяй гістарычных падзей. Прымаючы ўдзел у розных фестывалях, яны дапамагаюць акунуцца ў атмасферу эпохі, калі ішла барацьба за жыццё, за незалежнасць сваёй зямлі.

Асноўныя формы правядзення мерапрыемстваў па ваенна-патрыятычным выхаванні: урокі мужнасці, дні воінскай славы, мерапрыемствы па ўвекавечанні памяці загінуўшых у барацьбе за незалежнасць нашай Радзімы (штогадовая Вахта памяці каля Вечнага агню 9 мая, добраўпарадкаванне воінскіх пахаванняў і інш.), сустрэчы з ветэранамі і аказанне ім шэфскай дапамогі, тэматычныя экскурсіі ў музеі і воінскія часці, прагляд і абмеркаванне кінафільмаў ваеннай тэматыкі, квэст-гульні, спартыўна-масавыя мерапрыемствы (ваенна-спартыўныя гульні «Зарнічка», «Зарніца», спартакіяда дапрызыўнай моладзі) і іншыя патрыятычныя праекты і конкурсы.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Пакажыце гістарычную абумоўленасць узнікнення традыцыі святкавання дзяржаўных святаў.
2. Пералічыце святы, якія лічацца дзяржаўнымі?
3. Пералічыце асноўныя кампаненты абрадава-рытуальнай часткі дзяржаўнага свята.

4. Пакажыце гістарычную абумоўленасць узнікнення традыцыі святкавання ваенна-патрыятычных святаў.
5. Пералічыце святы, якія можна аднесці да ваенна-патрыятычных?
6. Пералічыце асноўныя кампаненты абрадава-рытуальнай часткі ваенна-патрыятычнага свята.
7. Назавіце гістарычную абумоўленасць узнікнення традыцыі святкавання чалавека працы або прафесійных свят?

**Літаратура:**

*Беларусы* : у 12 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [і інш.]. – 2002. – 606 с.
*Дзяржаўная* праграма «Культура Беларусі».
*Кодэкс* Рэспублікі Беларусь аб культуры (2016).
*Конович, А. А.* Театрализованные праздники и обряды в СССР / А. А. Конович. – М. : Высш. шк., 1990. – 206 с.
*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс]: учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856.
*Шубина, И. Б.* Драматургия и режиссура зрелища: Игра, сопровождающая жизнь : учеб.-метод. пособие / И. Б. Шубина. – Ростов н/Д : Феникс, 2006. – 288 с.
*Черняк, Ю. М.* Режиссура праздников и зрелищ : учеб. пособие для студентов / Ю. М. Черняк. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 223 с.

*Тэма 2. Міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі, рухі, акцыі*

Гісторыя Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў (Гавана, Масква). Фестываль музыкі ў г. Сопат (Польшча). Гісторыя ўзнікнення міжнароднага музычнага фестываля «Еўрабачанне». Дзіцячы міжнародны музычны фестываль «Еўрабачанне».

Станаўленне міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў і конкурсаў ў Рэспубліцы Беларусь.“Праз мастацтва – да міра і ўзаемапаразумення” – дэвіз Міжнароднага фестываля мастацтваў “Славянскі базар ў Віцебску”. У гэтым дэвізе заключаны асноўныя ідэі Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Гэты зварот да ўсіх удзельнікаў фестывалю, заклік да міру, гармоніі і дасканаласці.

Новыя фарматы культурнага адпачынку гараджан. «Ноч музеяў» – сусветная акцыя, прымеркаваная да Міжнароднага дня музеяў. Начны агляд музейных экспазіцый. 15 жніўня – дзень бібліятэк у Беларусі.

«Біблiяноч» – міжнародная сацыяльна-культурная акцыя, прысвечаная чытанню. Пашырэнне часу і фармату працы бібліятэк, кнігарань, літаратурных музеяў і арт-прасторы. «Біблiяноч» – штогадовая міжнародная сацыяльна-культурная акцыя, прысвечаная чытанню. У гэтую ноч бібліятэкі, кнігарні, літаратурныя музеі і арт-прасторы пашыраюць час і фармат сваёй працы. Музей як інавацыйная гульнявая пляцоўка. Музей "блізкі і далёкі" – сацыяльная і псіхалагічная умова для міжнароднай акцыі "Ноч музеяў". Міжнародны дзень музеяў (1977).

Новы фармат працы бібліятэк, кнігарняў, літаратурных музеяў і арт-прасторы. Мэта акцый – паказаць рэсурс, магчымасці, патэнцыял сучасных музеяў і бібліятэк краіны, зацікавіць моладзь для наведвання. Тэматыка акцый.

Папулярызацыя чытання і абуджэнне цікавасці да бібліятэчных экспазіцый. Акцыя ў падтрымку чытання "Бібліяноч" – унікальны прыклад таго, як супольнасць людзей, аб'яднаўшыся, могуць памяняць уяўленне цэлага пакалення аб сваёй рабоце. Бібліятэкі прыдумляюць новыя формы працы з чытачамі, праект адразу ахапіў сотні ўстаноў культуры па ўсёй краіне. Колькасць удзельнікаў з кожным годам расце, што падкрэслівае карыснасць праекту, значнасць для грамадства і папулярнасць сярод насельніцтва Мэта дадзеных рэкамендацыі – аказанне метадычнай дапамогі бібліятэкарам-арганізатарам акцыі на этапах яе планавання, падрыхтоўкі, рэалізацыі і падвядзення вынікаў. Авалоданне прапанаванай методыкай можа стаць асновай для правядзення падобных мерапрыемстваў, таксама будзе садзейнічаць павышэнню матывацыі бібліятэкараў і карыстальнікаў да ўдзелу ў акцыі.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Як вы разумееце ролю музычных і творчых фестываляў, свят і конкурсаў на сучасным этапе.
2. Што з'яўзляецца галоўнай мэтай штогадовага міжнароднага музычнага фестываля "Еўрабачанне".
3. Які слоган пра мастацтва стаў дэвіза Міжнароднага фестываля мастацтваў "Славянскі базар ў Віцебску".
4. Як называецца міжнародная сацыяльна-культурная акцыя, прысвечаная чытанню.
5. Сфармулюйце мэту акцый "Бібліяноч".
6. У чым праяўляецца новы фармат працы бібліятэк, кнігарняў, літаратурных музеяў.
7. Пералічыце спецыяльныя праграмы, якія выкарыстоўваюцца ў акцыі "Бібліяноч".

8. Які слоган з’яўляецца галоўнай умовай для міжнароднай акцыі “Ноч музеяў”.
9. Назавіце фармат міжнароднай акцыі “Ноч музеяў”.
10. Пералічыце спецыяльныя праграмы міжнароднай акцыі “Ноч музеяў”.
11. Узгадайце тэматыку міжнароднай акцыі “Ноч музеяў” у Беларусі.

## Літаратура:


*Беларусы :* у 12 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [і інш.]. – 2002. – 606 с.
*Дзяржаўная* праграма «Культура Беларусі».
*Кодэкс* Рэспублікі Беларусь аб культуры (2016).
*Конович, А. А.* Театрализованные праздники и обряды в СССР / А. А. Конович. – М. : Высш. шк., 1990. – 206 с.
*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс]: учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856.
*Шубина, И. Б.* Драматургия и режиссура зрелища: Игра, сопровождающая жизнь : учеб.-метод. пособие / И. Б. Шубина. – Ростов н/Д : Феникс, 2006. – 288 с.
*Черняк, Ю. М.* Режиссура праздников и зрелищ : учеб. пособие для студентов / Ю. М. Черняк. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 223 с.


## *Тэма 3. Мастацка-спартыўныя відовішчы, спартакіяды. Алімпійскія, Паралімпійскія, Дэльфійскія гульні*

Гісторыя ўзнікнення і развіцця алімпійскага руху. Першыя спартыўныя гульні. Умовы, пераможцы, роля ўзнагарод. Старажытная Грэцыя, г. Спарта. Паняцце “Алімп”. Спартакіяда. Алімпіяда. Паралімпіяда – міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы для людзей з інваліднасцю.

Узнікненне Алімпійскіх гульняў (776 год да н.э.). Рэлігійныя цырымоніі як абавязковая частка антычных Алімпійскіх гульняў: *ахвярапрынашэнні* багам-заступнікам ў першы і апошні дзень гульняў. Спачатку выключна спартовыя спаборніцтвы, пазней гульні ператварыліся ў грандыёзнае свята. Абвяшчэнне новых законаў, заключэнне гандлёвых пагадненняў, публічныя выступы паэтаў і музыкаў, выставы работ скульптараў і мастакоў. На час Алімпійскіх гульняў заключалася перамір'е, прадстаўнікі варагуючых полісаў праводзілі мірныя перамовы.

Уплыў Алімпійскіх гульняў на развіццё грэчаскай культуры. У перыяд

росквіту антычнай Грэцыі Алімпійскія гульні выконвалі цэлы шэраг сацыяльных функцый:*этнакансалідуючую, рэлігійную, культурную, эканамічную, палітычную, відовішчную.*Найбольшая сацыяльная значнасць Алімпійскіх гульняў гэтага перыяду вызначалася, у першую чаргу, іх уплывам на аб'яднанне грэчаскага свету і фарміраванне адзінай нацыянальнай самасвядомасці.

Адраджэнне Алімпійскіх гульняў у канцы XIX ст. французскім грамадскім дзеячам П'ерам дэ Кубертенам. Летнія Алімпійскія гульні: час правядзення. У 1924 г. заснаваны зімовыя Алімпійскія гульні. З 1988 г. праводзяцца Паралімпійскія гульні для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Прынцыпы, правілы і палажэнні Алімпійскіх гульняў вызначаны Алімпійскай хартыяй (1894) і каардынуюцца Міжнародным алімпійскім камітэтам (МАК). Згодна хартыі, Алімпійскія гульні «аб'ядноўваюць спартсменаў усіх краін у сумленных і раўнапраўных спаборніцтвах. У адносінах да краін і асобным людзей не дапускаецца ніякай дыскрымінацыі па расавых, рэлігійных або палітычных матывах».

Грандыёзныя цырымоніі адкрыцця і закрыцця сучасных Алімпійскіх гульняў як масавыя шоў сусветнага ўзроўню. Традыцыйныя рытуалы сучасных Алімпійскіх гульняў.

Дэльфійскія гульні – спаборніцтвы (конкурсы, фестывалі), выставы і прэзентацыі ў розных галінах мастацтва. Вытокі сучасных Дэльфійскіх гульняў (антычных Піфійскія гульні, старажытнагрэчаскі г. Дэльфы).

Традыцыйныя цырымоніі адкрыцця і закрыцця мастацка-спартыўных відовішчаў.

Відовішчы і прадстаўленні на стадыёнах. Комплекс разнастайных спартыўных, культурных, мастацка-тэматычных мерапрыемстваў на вялікай тэрыторыі (стадыёны, паркі, вуліцы). Навыкі арганізацыі вялікай колькасці ўдзельнікаў. Сродкі мастацкай выразнасці. Трохмерная адкрытая прастора. Амфітэатр. Мастацка-спартыўныя мерапрыемствы на вадзе.

Традыцыі провадаў і сустрэч беларускіх спартсменаў. Мастацкае вырашэнне цырымоній адкрыцця і закрыцця спартыўных гульняў.

Еўразійскіх гульняў. Спартакіяды і універсіяды на сучасным этапе. Мінскі паўмарафон. Міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта РБ. Рэспубліканскае спартыўнае свята «Мінская лыжня» і інш.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Як вы разумееце алімпійскі рух?
2. Азначце змест і задачы алімпійскіх гульняў.
3. Якія спартакіяды і універсіяды на сучасным этапе вы ведаеце?
4. Як вы разумееце паняцце “дэльфійскія гульні”?

**Літаратура:**

*Беларусы :* у 12 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [і інш.]. – 2002. – 606 с.
*Дзяржаўная* праграма «Культура Беларусі».
*Кодэкс* Рэспублікі Беларусь аб культуры (2016).
*Конович, А. А.* Театрализованные праздники и обряды в СССР / А. А. Конович. – М. : Высш. шк., 1990. – 206 с.
*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс]: учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856.
*Шубина, И. Б.* Драматургия и режиссура зрелища: Игра, сопровождающая жизнь : учеб.-метод. пособие / И. Б. Шубина. – Ростов н/Д : Феникс, 2006. – 288 с.
*Черняк, Ю. М.* Режиссура праздников и зрелищ : учеб. пособие для студентов / Ю. М. Черняк. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 223 с.

# 3.ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ

## 3.1 Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны (вочнае навучанне)

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі | | | |
| **Уводзіны.** Свята як частка культуры | 2 | | | | |
| **Раздзел I. Гісторыя фарміравання беларускага народнага календара ў кантэксце традыцый сусветных календароў** | | | | | |
| *Тэма 1.* Каляндар як складовая частка культуры. Месяцовы і сонечны календары. Параўнальны аналіз сусветных старажытных календароў | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 2.* Шляхі фарміравання юліянскай сістэмы летазлічэння як прататыпа сучаснага календара | 2 | | | | |
| *Тэма 3.* Светапоглядныя асновы хрысціянства. Прынцыпы структу-равання хрысціянскага календара. Свята Пасхі. Пасхалія. Суаднесенасць веснавых свят беларускага трады-цыйнага календара з пасхальным цыклам | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 4.* Дыялог культур: суіснаванне народна-ведыйскага і хрысціянскага календароў у гістарычным кантэксце. Грыгарыянская рэформа календара | 2 | 2 | | 1 | абарона прэзентацыі |
| **Раздзел II. Традыцыйныя рытуалы і святы ў сусветных культурах** | | | | | |
| *Тэма 1.* Культы і святкаванні старажытных цывілізацый. | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 2.* Гісторыя асноўных традыцый-ных свят усходніх краін (Кітай, Японія) | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| *Тэма 3.* Святочная культура Сярэдневякоўя, эпох Рэнесансу і Рэфармацыі | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| **Раздзел III. Гісторыя фарміравання беларускай святочнай культуры (дыялог народнай і хрысціянскай традыцый)** | | | | | |
| *Тэма 1.* Космапланетарныя асновы структуры беларускага народнага календара | 2 | 2 | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 2.* Пантэон вярхоўных багоў як міфалагічная аснова структурнай упарадкаванасці традыцыйнага календара (“каляндарныя” багі) | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 3.* Культ продкаў у сістэме каляндарных святкаванняў | 2 | 2 | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 4.* Народная дэманалогія ў сістэме каляндарных святкаванняў | 2 | 2 | | | |
| *Тема 5.* Традыцыі навалецця ў міфарытуальных практыках беларусаў | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тема 6.* Ушанаванне першаэлементаў славянскай касмагоніі ў структуры народнага календара: апазіцыі “Неба – Зямля”, “вада – агонь” | 2 | | | | |
| *Тэма 7.* Аброчная традыцыя ў сістэме каляндарных абрадаў беларусаў | 2 | | | | |
| *Тэма 8.* Беларускі карнавал: маскі і маскаванне, пераапрананне | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 9.* Гульня як абавязковая частка беларускай святочнай культуры | 2 | 2 | | 1 | абарона гульнёвай праграмы |
| **Раздзел IV. Святочная культура: традыцыі і навацыі** | | | | | |
| *Тэма 1.* Дзяржаўныя святы і цырыманіялы. Прафесійныя святы. Гістарычныя і ваенныя святы | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 2.* Міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі, рухі, акцыі | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 3.* Мастацка-спартыўныя відовішчы, спартакіяды. Алімпійскія, Паралімпійскія, Дэльфійскія гульні | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| **Усяго…** | **40** | **16** | | **12** | |

## 3.2 Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны (завочнае навучанне)

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі | | | |
| **Уводзіны.** Свята як частка культуры | 2 | | | | |
| **Раздзел I. Гісторыя фарміравання беларускага народнага календара ў кантэксце традыцый сусветных календароў** | | | | | |
| *Тэма 1.* Каляндар як складовая частка культуры. Месяцовы і сонечны календары. Параўнальны аналіз сусветных старажытных календароў | 2 | | | | |
| *Тэма 2.* Шляхі фарміравання юліянскай сістэмы летазлічэння як прататыпа сучаснага календара | 2 | | | | |
| *Тэма 3.* Светапоглядныя асновы хрысціянства. Прынцыпы структуравання хрысціянскага календара. Свята Пасхі. Пасхалія. Суаднесенасць веснавых свят беларускага традыцыйнага календара з пасхальным цыклам | 2 | | | | |
| *Тэма 4.* Дыялог культур: суіснаванне народна-ведыйскага і хрысціянскага календароў у гістарычным кантэксце. Грыгарыянская рэформа календара | 2 | | | | |
| **Раздзел II. Традыцыйныя рытуалы і святы ў сусветных культурах** | | | | | |
| *Тэма 1.* Культы і святкаванні старажытных цывілізацый. | | 2 | | | |
| *Тэма 2.* Гісторыя асноўных традыцыйных свят усходніх краін (Кітай, Японія) | | | | | |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| *Тэма 3.* Святочная культура Сярэдневякоўя, эпох Рэнесансу і Рэфармацыі | 2 | | | | |
| **Раздзел III. Гісторыя фарміравання беларускай святочнай культуры (дыялог народнай і хрысціянскай традыцый)** | | | | | |
| *Тэма 1.* Космапланетарныя асновы структуры беларускага народнага календара | | 2 | | | |
| *Тэма 2.* Пантэон вярхоўных багоў як міфалагічная аснова структурнай упарадкаванасці традыцыйнага календара (“каляндарныя” багі) | | | | | |
| *Тэма 3.* Культ продкаў у сістэме каляндарных святкаванняў | | | | | |
| *Тэма 4.* Народная дэманалогія ў сістэме каляндарных святкаванняў | | | | | |
| *Тема 5.* Традыцыі навалецця ў міфарытуальных практыках беларусаў | | | | | |
| *Тема 6.* Ушанаванне першаэлементаў славянскай касмагоніі ў структуры народнага календара: апазіцыі “Неба – Зямля”, “вада – агонь” | | | | | |
| *Тэма 7.* Аброчная традыцыя ў сістэме каляндарных абрадаў беларусаў | | | | | |
| *Тэма 8.* Беларускі карнавал: маскі і маскаванне, пераапрананне | | | | | |
| *Тэма 9.* Гульня як абавязковая частка беларускай святочнай культуры | | | | | |
| **Раздзел IV. Святочная культура: традыцыі і навацыі** | | | | | |
| *Тэма 1.* Дзяржаўныя святы і цырыманіялы. Прафесійныя святы. Гістарычныя і ваенныя святы | | 2 | | | |
| *Тэма 2.* Міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі, рухі, акцыі | | | | | |
| *Тэма 3.* Мастацка-спартыўныя відовішчы, спартакіяды. Алімпійскія, Паралімпійскія, Дэльфійскія гульні | | | | | |
| **Усяго…** | **12** | **6** | | | |

# 4.ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 4.1 Тэматыка да семінарскіх заняткаў

**Семінаркія заняткі № 1**
***Тэма 1. Каляндар як складовая частка культуры.***

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Паняцце “каляндар”: азначэнне, гістарычная і прыродазнаўчая абумоўленасць.
2. Месяцовы календар: гісторыя стварэння, гістарычная і прыродазнаўчая абумоўленасць.
3. Сонечны календар: гісторыя стварэння, гістарычная і прыродазнаўчая абумоўленасць.
4. Параўнальны аналіз сусветных старажытных календароў.

**Семінарскія заняткі № 2**
***Тэма 3. Светапоглядныя асновы хрысціянства.***

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Прынцыпы структуравання хрысціянскага календара.
2. Свята Пасхі: хрысціянскія каноны і народнае бытаванне.
3. Пасхалія: асновы структурыравання.
4. Суаднесенасць веснавых свят беларускага трады-цыйнага календара з пасхальным цыклам.

**Семінарскія заняткі № 3**
***Тэма 4. Дыялог дзвюх культур на тэрыторыі пражывання сучасных беларусаў.***

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Паняцце М. Бахціна “дыялог культур”
2. Суіснаванне народна-ведыйскага і хрысціянскага календароў у гістарычным кантэксце.
3. Абумоўленасць Грыгарыянскай рэформы юліянскага календара.

**Семінарскія заняткі № 4**
***Тэма 1. Космапланетарныя асновы структуры беларускага народнага календара***

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Рух Зямлі па небасхіле.
2. Зімовае і летняя сонцастаянні, прымеркаваныя да гэтых падзей святы беларускага народнага календара.
3. Веснавое і восеньскае раўнадзенствы, прымеркаваныя да гэтых падзей святы беларускага народнага календара.
4. Поры года, неаднолькавыя кліматычныя умовы тэрыторыі Беларусі. Святы, прымеркаваныя да пераходаў з адной пары года ў другую.

**Семінарскія заняткі № 5**
***Тэма 2. Пантэон вярхоўных багоў як міфалагічная аснова структурнай упарадкаванасці традыцыйнага календара ("каляндарныя" багі)***

**Пытанні для абмеркавання:**
1. Паняцце "каленадрныя багі" і беларускі народны каляндар.
2. Пантэон вярхоўных багоў славянскай міфалогіі.

**Семінарскія заняткі № 6**
***Тэма 3. Культ продкаў у сістэме каляндарных святкаванняў***

**Пытанні для абмеркавання:**
1. Паняцце "культ".
2. Міфалагічныя ўяўленні беларусаў аб ролі продкаў ў жыцці іх прадаўжальнікаў.
3. Асноўныя дні ўшанавання продкаў у беларускім народным календары.
4. Рэгіянальныя асаблівасці ўшанавання продкаў у Беларусі.

**Семінарскія заняткі № 7**
***Тэма 5. Традыцыі навалецця ў міфарытуальных практыках беларусаў***

**Пытанні для абмеркавання:**
1. Прынцыпы сустрэчы Новага года або рытуалы "пераходу" у традыцыйнай культуры беларусаў.
2. Роля калядоўшчыкаў у сустрэчы Новага года.
3. Роля валачобнікаў у сустрэчы Новага года.
4. Камаедзіца – свята навалецця.

**Семінарскія заняткі № 8**
***Тэма 1. Дзяржаўныя святы. і цырыманіялы. Прафесійныя святы. Гістарычныя і ваенныя святы. Фестывалі, рухі, акцыі.***

**Пытанні для абмеркавання:**

1. Свята і цырыманіял.
2. Дзяржаўныя святы Рэспублікі Беларусь.
3. Прафесійныя святы.
4. Гістарычныя святы.
5. Ваенныя святы.
6. Міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі, рухі, акцыі.

# 5.РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 5.1 Пытанні да экзамену па дысцыпліне «Гісторыя свят»

### Раздзел І. Гісторыя фарміравання беларускага народнага календара ў кантэксце традыцый сусветных календароў

1. Свята як частка культуры.
2. Класіфікацыя свят.
3. Каляндар як галоўная складовая культуры.
4. Асновы пабудовы беларускага народнага календара.
5. Ушанаванне продкаў як абавязковая складовая беларускага народнага календара.
6. Месяцовы і сонечны календары ў старажытных культурах свету.
7. Параўнальны аналіз сусветных старажытных календароў
8. Шляхі фарміравання юліянскай сістэмы летазлічэння як прататыпа сучаснага календара.
9. Светапоглядныя асновы і прынцыпы структурыравання хрысціянскага календара
10. Хрысціянская Пасхалія: падставы ўзнікнення, правілы Нікейскага Сабора (325 г.).
11. Суаднесенасць веснавых святаў традыцыйнага календара з Пасхальным цыклам святкаванняў.
12. Недакладнасці юліянскага календара.
13. Грыгарыянская рэформа календара.
14. Гісторыя ўзнікнення назваў месяцаў гадавога цыкла.
15. Умовы ўзнікнення ў Беларусі 2-х хрысціянскіх календароў (каталіцкі і праваслаўны).
16. Дыялог культур: суіснаванне народна-ведыйскага і хрысціянскага календароў у гістарычным кантэксце.
17. Рухомыя і нерухомыя святы беларускага народнага календара.

### Раздзел ІІ. Традыцыйныя рытуалы і святы ў сусветных культурах

18. Культы і святкаванні старажытных цывілізацый.
19. Культ продкаў ў беларускай традыцыйнай культуры
20. Гісторыя асноўных традыцыйных свят Старажытнага Егіпта
21. Гісторыя свят Старажытнага Рыма.
22. Гісторыя свят Старажытнай Грэцыі.

23. Алімпійскія гульні: гісторыя паходжання.
24. Алімпійскія гульні на сучасным этапе.
25. Гісторыя асноўных традыцыйных свят Старажытнага Кітая.
26. Гісторыя асноўных традыцыйных свят Старажытнай Японіі.
27. Святочная культура Сярэдневечча: гістрыёны.
28. Святочная культура Сярэдневечча: ваганты.
29. Святочная культура Сярэдневечча: жанглёры.
30. Святочная культура Адраджэння: тэатр.
31. Святочная культура Адраджэння: камедыя масак.
32. Святочная культура Адраджэння: містэрыя.
33. Святочная культура Адраджэння: працэсія.
34. Святочная культура Адраджэння: маскарад.
**35.** Святочная культура Адраджэння: карнавал.

## Раздзел ІІ. Рытуалы і святы беларускага народнага календара (дыялог народнай і хрысціянскай традыцый)

36. "Каляды: Першая куцця – Раство Хрыстова",
37. "Каляды: Другая куцця – св. Васіль",
38. "Каляды: Трэцяя куцця – Вадохрышча",
39. "Грамніцы – Стрэчанне",
40. "Масленіца – Мясапуст",
41. "Камаедзіца",
42. "Дабравешчанне – Благавешчанне"
43. "Гуканне вясны – Аўдоцця",
44. "Саракі" – "Саракасвятыя"
45. "Белы тыдзень – Чысты чацвер",
46. "Вялікдзень – Пасха",
47. "Наўскі чацвер – Радаўніца";
48. "Ваджэнне стралы" – Ушэсце",
49. "Юр'е – Ярыла";
50. "Зялёныя святы: Сёмуха, Троіца",
51. "Зялёныя святы: Русальны тыдзень",
52. "Купалле – Іван Купала",
53. "Спас: Мядовы",
54. "Спас: Яблычны",
55. "Спас: Арэхавы",
56. "Жніво: Зажынкі, Жніво, Дажынкі",
57. "Багач – Раство Багародзіцы";

58. “Узвіжанне”,
59. “Пакровы – Пакроў Багародзіцы”,
60. “Восеньскія (Дзмітраўскія, Міхайлаўскія) Дзяды”.

## 5.2 Заданне для самастойнай работы студэнтаў, якая кантралюецца:

Падрыхтоўка творчай работы (прэзентацыі) па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя свят» спрыяе выкарыстанню атрыманых ведаў у практычнай дзейнасці. У творчай рабоце неабходна выкарыстоўваць дакладныя веды пра гісторыю святочнай культуры, уменне карыстацца першакрыніцамі, структурыраваць матэрыял. Абарона творчай работы (прэзентацыі) павінна ўключаць фота-, відэаматэрыялы, песенную спадчыну, тэатралізацыю, акцёрскую манеру выкладання.

1. Дыялог культур: суіснаванне народна-ведыйскага і хрысціянскага календароў у гістарычным кантэксце.
2. Культы і святкаванні старажытных цывілізацый.
3. Гісторыя асноўных традыцыйных свят усходніх краін (Кітай, Японія)
4. Святочная культура Сярэдне-вякоўя, эпох Рэнесансу і Рэфармацыі
5. Космапланетарныя асновы структуры беларускага народнага календара
6. Культ продкаў у сістэме каляндарных святкаванняў
7. Народная дэманалогія ў сістэме каляндарных святкаванняў
8. Ушанаванне першаэлементаў славянскай касмагоніі ў структуры народнага календара: апазіцыі “Неба – Зямля”, “вада – агонь”
9. Беларускі карнавал: маскі і маскаванне, пераапрананне
10. Гульня як абавязковая частка беларускай святочнай культуры
11. Дзяржаўныя святы і цырыманіялы.
12. Міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі, рухі, акцыі

.

# 6.ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## 6.1 Спіс асноўнай і дадатковай літаратуры


*Асноўная*

*Котляров,* М. Г. Народные праздники : практикум [Электронный ресурс]: [16+] / М. Г. Котляров ; Кемеровский государственный институт культуры, Факультет музыкального искусства, Кафедра народного хорового пения. – Кемерово : Кемеровский государственный институт культуры (КемГИК), 2018. – 59 с. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=613067.

*Котович,* О. В. Сакральный мир традиции. 99 уроков народной культуры : науч. изд. / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2018. – 578 с.

*Махлина,* С.Т. Художественная культура Востока. Повседневность и праздники : учеб. пособие для вузов / С. Т. Махлина. – Москва : Юрайт, 2020. – 194, [1] с. : рис. ; 25х16 см. – (Высшее образование).

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс]: учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856.

*Дадатковая*

*Агапкина,* Т. А. Мифопоэтические основы славянского народного календаря. Весенне-летний цикл / Т. А. Агапкина. – М. : Индрик, 2002. – 816 с.

*Байбурин, А. К.* Ритуал в традиционной культуре / А. К. Байбурин. – СПб. : Наука, 1993. – 240 с.

Беларусы : у 12 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 6 : Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [і інш.]. – 2002. – 606 с.

*Барышаў, Г. І.* Батлейка / Г. І. Барышаў / М-ва культуры Рэсп. Беларусь ; Беларускі ўніверсітэт культуры. – Мінск, 2000. – 270 с.

*Бахтин, М. М.* Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренессанса / М. М. Бахтин. – М. : Худож. лит., 1990. – 543 с.

Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўнік / рэдкал.: С. Санько (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск : Беларусь, 2006. – 599 с.

*Брабич, В. М.* Зрелища Древнего мира / В. М. Брабич, Г. С. Плетнева. – Л. : Искусство, 1971. – 78 с.

Беларускі народны каляндар / аўт.-уклад. А. Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 1992. – 205 с.

Гульні, забавы, ігрышчы / рэдкал.: А.С.Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 534 с.

*Гусев, В.Е.* Народные игры, драмы и театр / В.Е. Гусев // Этнография восточных славян. Очерки традиционной культуры. – М.: Наука, 1987. – 458 с.

*Гуд, П. А.* Ад Каляд да Пакроваў / П. А. Гуд ; рэд.-склад. Л. І. Жук. – Мінск : Красіка-Прынт, 2000. – 223 с. – (Беларусь святочная).

*Гуд, П. А.* Беларускі купальскі комплекс і семантыка абрадавых дзей / П. А. Гуд. – Мінск : Тэхнапрынт, 1999. – 221 с.

*Гуд, П. А.* Беларускі кірмаш / П. А. Гуд, Н. І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 268 с.

*Гуд, П. А.* Мастацтва феерверкаў: вогненна-светлавыя дзеі народаў свету / П. А. Гуд. – Мінск : Мэджик Бук, 2007. – 99 с.

*Гутько, О. В.* История праздников : учеб. пособие / О. В. Гутько. – Челябинск, 2013. – 189 с.

*Даркевич, В. П.* Народная культура средневековья. Светская праздничная жизнь в искусстве IX–XVI вв. / В. П. Даркевич ; отв. ред. Г. К. Вагнер. – М. : Наука, 1988. – 344 с.

Жыцця адвечны лад. Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Мастац. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.

Земляробчы каляндар: абрады і звычаі / Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; [рэд. кал.: В. К. Бандарчык, К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік (гал. рэд.) ; уклад., класіфікацыя, сіст. матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

Зямля стаіць пасярод свету… / уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 591 с. – (Беларускія народныя прыкметы і павер'і ; кн. 1.)

Зямная дарога ў вырай/ уклад., прадм., пер. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 654 с. – (Беларускія народныя прыкметы і павер'і ; кн. 3.)

Ивлева, Л. М. Ряженье в русской традиционной культуре / Л. М. Ивлева. – СПб. : Рос. ин-т истории искусств, 1994. – 235 с.

*Калачова, І. І.* Народныя традыцыі і звычаі выхавання: этнапедагагічная спадчына этнасаў Беларусі / І.І.Калачова. – Мінск: Беларусь, 1999. – 179 с.

Календарный вопрос : сб. ст. / ред.-сост. А. Чхартишвили. – М. : Изд-во Сретен. монастыря, 2000. – 345 с.

Каляндарна-абрадавая паэзія / А. С. Ліс, А. І. Гурскі, В. М. Шарая, У. М. Сівіцкі ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навук. рэд.А. С. Фядосік. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 515 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 1. – 359 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 2. – 413 с.

*Катовіч, А.* Зімовыя святы : навук.-папуляр. выд. / А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск : Мастац. літ., 2004. – 119 с.

*Катовіч, А.* Летнія святы : навук. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – Кн. 1. – 368 с.

*Катовіч,* А. В. Мікольская "Свяча" – феномен абрадавай практыкі беларусаў (в. Чарапы Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці) / Аксана Катовіч, Янка Крук. – Мінск : Інбелкульт, 2013. – 93 с.

*Климишин, И. А.* Календарь и хронология / И. А. Климишин. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Наука, 1985. – 320 с.

*Конович, А. А.* Театрализованные праздники и обряды в СССР / А. А. Конович. – М. : Высш. шк., 1990. – 206 с.

*Котович, О. В.* Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.

*Криничная,* Н. А. Русская мифология: мир образов фольклора /Н. А. Криничная. – М. : Академ. Проект : Гаудеамус, 2004. – 1006 с.

*Крук,* І. І. Следам за сонцам: Бел.нар.каляндар: Дапаможнік для педагогаў дзіцячых дашк. устаноў / І.І. Крук. – Мінск : Ураджай, 1998. – 216 с.

*Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры : навук. выд. / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2011. – 430 с.

*Кухаронак,* Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск: Ураджай, 2001. – 239 с.

*Лозка,* А. Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні / А.Лозка. – Мінск: Тэхналогія, 1997. – 183 с.

Легенды і паданні / [склад.: М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі ; рэдкал.: В. К. Бандарчык і інш.; рэд. тома А. С. Фядосік ; уступ. арт. М. Я. Грынблата]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.

Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад.: І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. : Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.

Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – М. : Советская Энциклопедия, 1987. – Т.1 : А-К. – 671 с.

Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – М. : Советская Энциклопедия, 1988. – Т. 2 : К-Я. – 719 с.

Народны тэатр / уклад. М.А. Каладзінскі. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 554с.

*Ненадавец,* А. М. За смугою міфа / А. М. Ненадавец. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 254 с.

*Ненадавец,* А. М. Міфалогія роднага краю / А. М. Ненадавец. – Мінск : Беларусь, 2018. – 399 с.

*Ненадавец,* А. М. Нарысы беларускай міфалогіі / А. М.Ненадавец. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – 535 с.

*Ненадавец,* А. М. Сілаю слова. Чорная і белая магія / А.М. Ненадавец. – Мінск : Беларусь, 2002. – 350 с.

*Новак,* В. С. Міфалогія беларусаў / В. С. Новак. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2005. – 252 с.

*Орлов, О. Л.* Теоретические аспекты изучения праздничной культуры России / О. Л. Орлов. – СПб. : СПбГУКИ, 2001.

*Пави, П.* Словарь театра / П. Пави. – М. : ГИТИС, 2003. – 504 с.

*Рябков, В. М.* Антология форм праздничной и развлекательной культуры России (первая половина XX в.) : учеб. пособие / В. М. Рябков ; Челяб. гос. акад. культуры и искусств. – Челябинск : Полиграф-Мастер, 2007. – Т. 4. – 870 с.

*Сапронов,* П. А. Первобытный ритуал / П. А. Сапронов // Культурология : курс лекций по теории и истории культуры / П. А. Сапронов. – 2-е изд., доп. – СПб. : Лениздат : Союз, 2001. – С.103–114.

*Сержпутоўскі,* А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 302 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2001–2010. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе, 2001. – 797 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2001 –2010. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне, 2004. – 910 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2006. – 608 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2006. – 736 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 4: Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2009. – 863 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 5: Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1 / В. И. Басько [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2010. – 847 с.

*Шамак,* А. А. Міфалогія Старажытнай Беларусі / А. А. Шамак, – Мінск : Сэр-Віт, 2004. – 240 с.

*Шамякіна,* Т. І. Міфалогія Беларусі: нарысы: вучэб. дапаможнік / Т. І. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 399 с.

*Шамякіна,* Т. І. Славянская міфалогія : курс лекцый / Т.І. Шамякіна. – Мінск : РІВШ, 2005. – 155 с.

*Шапарова,* Н. С. Краткая энциклопедия славянской мифологии: ок. 1000 ст. / Н. С. Шапарова. – М. : АСТ и др., 2001. – 623 с.

*Шарая, О.Н.* Ценностно-нормативная природа почитания предков / О.Н.Шарая. – Минск:Технология, 2002. – 249 с.

*Шубина, И. Б.* Драматургия и режиссура зрелища: Игра, сопровождающая жизнь : учеб.-метод. пособие / И. Б. Шубина. – Ростов н/Д : Феникс, 2006. – 288 с.

*Черняк, Ю. М.* Режиссура праздников и зрелищ : учеб. пособие для студентов / Ю. М. Черняк. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 223 с.

*Цітоў, А. К.* Гарадская геральдыка Беларусі / А. К. Цітоў. – Мінск : Полымя, 1989. – 207 с.

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
БДУКМ
______________С.Л. Шпарло
______________2022
Рэгістрацыйны № ВД-___ /эвуч.

# ГІСТОРЫЯ СВЯТ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне модуля «Святочная культура Беларусі”*
*для спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках)*

2022

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя свят» – адна са спецыяльных дысцыплін модуля «Святочная культура Беларусі», выкладанне якой прадугледжана пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне традыцыйнай святочнай культуры.

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя свят» з'яўляецца базавай кампанентай у вывучэнні міфалагічных вытокаў рытуальна-абрадавай спадчыны і фарміраванні каляндарных сістэм розных народаў свету. Праграмай курса прадугледжана вывучэнне генезісу, структуры, сацыякультурных функцый міфа і рытуалу, месца фундаментальных катэгорый у фарміраванні этнакультурных карцін свету. Разгляд міфалагічных традыцый скіраваны на тыпалогію сістэм вярхоўных багоў і ніжэйшай дэманалогіі, іх цесную ўзаемасувязь з комплексамі каляндарных абрадавых практык. Важнай складовай курса з'яўляецца разгляд беларускай міфарытуальнай сістэмы ў кантэксце агульнасусветнай міфалагічнай традыцыі. Змест дысцыпліны пабудаваны ў логіцы непасрэднай сувязі з вывучэннем такіх спецыяльных дысцыплін, як «Традыцыйная святочная культура», «Сучасная святочная культура Беларусі», «Сучасныя формы святочнай культуры», «Асновы мастацкага афармлення свят і відовішчаў», «Рэжысура фальклорных прадстаўленняў», «Рэжысура тэатралізаваных прадстаўленняў і свят», «Музычна-шумавое вырашэнне свят» і інш. Выкладанне дысцыпліны ва ўзаемасувязі з іншымі дазваляе ў поўнай меры сфарміраваць у студэнтаў глыбокія веды і практычныя навыкі, неабходныя для пошуку шляхоў вырашэння творчых праблем увасаблення святочных дзеянняў на сучасным этапе.

*Мэта* выкладання вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя свят»: раскрыць гісторыка-культурныя, міфасемантычныя і тыпалагічныя аспекты вывучэння рытуальна-абрадавых практык еўразійскіх народаў; на падставе структурна-семантычнага і зместава-сімвалічнага аналізу сфарміраваць ў студэнтаў неабходныя веды і кампетэнцыі ў галіне традыцыйных рытуальна-абрадавых практык, якія павінны спрыяць развіццю сучаснай святочнай культуры народа.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– раскрыць асноўныя сістэмы паняццяў святочнай культуры, тыпалогію святочна-абрадавых комплексаў, звязаных з касмагоніяй і касмалогіяй у міфарытуальных традыцыях еўразійскіх народаў;

– раскрыць міфасемантычныя аспекты фарміравання рытуальна-абрадавых практык сакральнага календара ў еўразійскіх міфапаэтычных традыцыях;

– паказаць структурна-семантычныя і зместава-сімвалічныя асаблівасці рытуальна-абарадавых комплексаў навалецця ў этнакультурнай спадчыне

еўразійскіх народаў; сфарміраваць веды аб асноўных этапах гісторыі развіцця абрадавай культуры і яе святочных формаў;

– навучыць сінтэзаваць каштоўнасці матэрыяльнай і нематэрыяльнай этнакультурнай спадчыны Беларусі, вызначаць шляхі і спосабы актуалізацыі традыцыйных святочна-абрадавых практык у сучасным сацыякультурным працэсе;

– выявіць асаблівасці эвалюцыі традыцыйных каляндарна-абрадавых практык еўразійскіх народаў у кантэксце сучасных працэсаў глабалізацыі.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

*ведаць:*

– гісторыю фарміравання каляндарных сістэм розных народаў свету;

– этапы развіцця свята як феномена сусветнай культуры, разнастайныя трактоўкі яго вызначэння і межы выкарыстання састаўных частак свята (міф, рытуал, абрад, культ);

– асаблівасці светапоглядных сістэм у розных традыцыйных культурах;

– універсальную структуру рытуальна-абрадавых комплексаў;

– асноўныя коды фарміравання святочна-абрадавых комплексаў;

– сэнсавую і каштоўнасную накіраванасць святочных формаўтварэнняў у культурах розных народаў свету;

– тэндэнцыі ў развіцці святочнай культуры Беларусі (прынцыпы арганізацыі пастановак святочных мерапрыемстваў, іх новыя формаўтварэнні);

*умець:*

– вылучаць адметныя рысы пэўнай гістарычнай эпохі і ўвасабляць іх у святочным дзеянні ў сучасных умовах;

– сістэматызаваць, параўноўваць і абагульняць веды пра рознапланавыя сучасныя святочныя формаўтварэнні;

– распрацоўваць канцэптуальныя палажэнні аўтарскіх рэжысёрскіх праектаў на аснове ведаў па нематэрыяльнай культурнай спадчыне беларусаў;

– ажыццяўляць праекты фальклорна-этнаграфічнага вырашэння свят рознай тэматыкі, высокапрафесійна ўвасабляць ідэі абрадавых комплексаў на практыцы;

– выкарыстоўваць набытыя падчас вывучэння спецыяльнай дысцыпліны веды ў выкладчыцкай дзейнасці;

*валодаць:*

– метадамі і прыёмамі арганізацыі стварэння праектаў свят рознай тэматыкі з фальклорна-этнаграфічным вырашэннем;

– прынцыпамі пабудовы кампазіцыі, ведамі семантыкі і сімволікі галоўных персанажаў, атрыбутаў, рытуальных дзеянняў, адзення, słоваў і іншых складовых частак свят рознай тэматыкі і розных гістарычных эпох;

– методыкай раскрыцця рытуальна-гульнёвай кампаненты традыцыйных абрадавых комплексаў.

Мэтанакіраванае і асэнсаванае выкарыстанне ведаў па гісторыі культуры, узнікнення календара, традыцыйных свят і абрадаў розных народаў свету, параўнальны аналіз агульных рыс і адметнасцей дапамагае сфарміраваць неабходныя кампетэнцыі сучаснага высокакваліфікаванага рэжысёра свят і абрадаў.

На засваенне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя свят», дасягненне пастаўленай мэты і вырашэнне задач прадугледжана 180 гадзін, з іх аўдыторных – 68: лекцыі – 50, семінарскія заняткі – 18 гадзін. Форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны

*Свята як частка культуры*

Прадмет, мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя свят» – адной са спецыяльных дысцыплін пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне святочнай культуры. Этымалогія феномена свята. Сувязь з паняццямі «відовішча», «рытуал», «абрад», «цырымонія». Іерафанія Сонца і Месяца. Уздзеянне міфаў, культаў, магіі, вераванняў, рэлігіі на фарміраванне свята, абраду, рытуалу і іншых урачыстых падзей. Класіфікацыя свят і абрадаў.

### Раздзел I. Гісторыя фарміравання беларускай святочнай культуры: палілог каляндарных сістэм

*Тэма 1. Каляндар як складовая частка культуры. Месяцовы і сонечны календары. Параўнальны аналіз сусветных старажытных календароў*

Культуралагічнае паняцце «каляндар». Легенды аб стварэнні свету. Міфалагічная цыклічнасць часу. Біблейскія паданні аб часе стварэння свету. Лінейнасць у хрысціянскай канцэпцыі часу. Умоўнасць «кропкі адліку» часу. Эра ад стварэння свету. Хрысціянская эра: ад нараджэння Хрыста.

Салярная і месяцовая аснова ў гадавым колазвароце сельскагаспадарчых работ.

Уплыў іерафаніі Месяца і Сонца на фарміраванне сістэмы парадкавання часу. Змена фазаў Месяца як першааснова парадкавання часу. Адзінкі вымярэння часу на аснове цыклічнасці Месяца: тыдзень, месяц. Старажытныя месяцовыя календары: іўдзейскі, мусульманскі, рымскі. Асновы пабудовы старажытных месяцовых календароў шумераў і вавіланян.

Традыцыйныя ўяўленні аб асноўных пераходных момантах у задыякальным руху: дні зімовага і летняга сонцастаяння, веснавога і восеньскага раўнадзенства. Салярная цыклічнасць як аснова фарміравання каляндарных сістэм розных народаў. Паняцце «сонечны год». Адзінкі вымярэння часу на аснове сонечнай цыклічнасці: суткі і год. Старажытнаегіпецкі сонечны каляндар.

*Тэма 2. Шляхі фарміравання юліянскай сістэмы летазлічэння як прататыпа сучаснага календара*

Перадумовы рэформы старажытнарымскага календара. Гістарычная роля Гая Юлія Цэзара і грэчаскага астранома Сазігена Александрыйскага ў вызначэнні даўжыні сонечнага года. Паняцце «пачатак новага года». Дванаццацімесяцовы каляндарны год. Структурнае парадкаванне часу па месяцах. Гісторыя фарміравання сістэмы каляндарных працягласцей. Пастаянная дата дня веснавога раўнадзенства. Высакосны дзень і высакосны год. Ушанаванне стваральніка новай сістэмы злічэння часу Юлія Цэзара і яго паслядоўніка рымскага імператара Аўгуста.

*Тэма 3. Светапоглядныя асновы хрысціянства.*
*Прынцыпы структуравання хрысціянскага календара.*
*Свята Пасхі. Пасхалія. Уплыў праваслаўнай Пасхаліі*
*на структуру беларускага народнага календара.*

Новая гісторыя існавання чалавецтва на зямлі, новыя крытэрыі засваення часу. Царква як сацыяльны інстытут распаўсюджання хрысціянскай традыцыі. Каталіцызм, праваслаўе, пратэстантызм.

Гісторыя фарміравання і структурная ўпарадкаванасць хрысціянскага календара: ушанаванне асноўных падзей з жыцця Ісуса Хрыста і Дзевы Марыі.

Гістарычная роля Нікейскага сабора (325 г.) у фарміраванні будучага сусветнага календара. Гістарычнае значэнне прыняцце юліянскага календара. Увядзенне эры злічэння часу ад Раства Хрыстова. Асаблівасці святкавання іўдзейскай Пасхі. Сэнсава-семантычныя аспекты паняцця «пасха». Тайная вячэра, або апошняя Пасха, у жыцці Ісуса Хрыста. Распрацоўка правілаў вызначэння даты святкавання хрысціянскай Пасхі. Пасхалія, або час Хрыста. Асаблівасці структуравання хрысціянскай Пасхаліі – «календара ў календары».

Суаднесенасць веснавых свят беларускага народнага календара з пасхальным цыклам: рухомыя і нерухомыя святы.

*Тэма 4. Дыялог культур: суіснаванне традыцыйнага народнага*
*і хрысціянскага календароў у гістарычным кантэксце.*
*Грыгарыянская рэформа хрысціянскага календара*

Прыняцце хрысціянства ўсходнеславянскімі народамі. Складаны духоўныя, светапоглядныя, сацыякультурныя, прававыя і палітычныя аспекты працэса суіснавання дзвюх культур – народнай і хрысціянскай. Паняцце «двухвер'е», або «народнае праваслаўе». Уплыў феномена беларускай ментальнасці на збліжэнне дзвюх каляндарных сістэм. Сэнсава-семантычная абумоўленасць узнікнення абрадавых комплексаў традыцыйнай культуры.

Касмізм юліянскага календара (неадпаведнасць юліянскага года трапічнаму, або сонечнаму, цыклу). Супярэчнасці суаднесенасці прыродна-касмічнага упарадкавання календара вызначэння даты святкавання хрысціянскай Пасхі як передумова неабходнасці рэфармавання юліянскага календара. Гістарычная роля Папы Рымскага Грыгорыя XIII у рэфармаванні календара. Умовы каляндарнай рэформы.

Паступовае прыняцце грыгарыянскай рэформы краінамі свету. Пратэст Рускай праваслаўнай царквы супраць грыгарыянскай рэформы. Передумовы пераходу дзяржаўнага летазлічэння Савецкай Расіі на грыгарыянскі стыль.

## Раздзел II. Традыцыйныя рытуалы і святы ў сусветных культурах

### *Тэма 1. Культы і святкаванні старажытных цывілізацый.*

Культы і святкаванні старажытных цывілізацый. Сезонныя перыяды працы і адпачынку ў абрадава-святочнай дзейнасці культур старажытнасці. Тыпалогія свят у Старажытным Егіпце. Значныя рэлігійныя рытуалы і святы фараонаў.

Міфалогія старажытных грэкаў як аснова абрадавых дзей. Галоўныя святы ў культуры Старажытнай Грэцыі: свята ў гонар збору ўраджая вінаграду «Дзіянісавы дзеі»; Афінскія, Панафінскія, Піфійскія і іншыя гульні. Відовішчы ў старажытнагрэчаскім амфітэатры. З'яўленне Алімпійскіх гульняў.

Галоўныя рытуалы ў культуры Старажытнага Рыма: атэлана, буфанада, сатурналія як састаўныя часткі свят Апалона, Плебейскіх і Рымскіх гульняў.

### *Тэма 2. Гісторыя асноўных традыцыйных свят усходніх краін (Кітай, Японія).*

Дунчжыцзэ – свята ў гонар зімовага сонцастаяння ў Старажытным Кітаі. Новы год, або Свята вясны. Свята лодак-драконаў. Свята ліхатароў. Сімволіка галоўнай стравы свята. Сэнс навагодніх падарункаў. Цынмін («Свята чысціні і яснасці») – дзень памінання памерлых. Сучаснае ўвасабленне святочных кітайскіх традыцый.

Вызначэнне сэнсу жыцця праз святочную культуру Японіі. Танабата – свята ў гонар кахання і вернасці. Святкаванне Дня заснавання краіны – аднаго з галоўных свят. Хіган – свята пакланення продкам, якое адзначаецца штогод у дні вясновага і восеньскага раўнадзенства. Абон (Бон) – дні памінання, якія таксама называюць Святам ліхтароў.

*Тэма 3. Святочная культура Сярэдневякоўя, эпох Рэнесансу і Рэфармацыі*

Распад Рымскай імперыі, станаўленне феадалізму. Супрацьстаянне хрысціянства і язычніцтва. Хэлоўін. Карнавал. Гістрыёны, жанглёры, ваганты. Жанравая дыферэнцыяцыя іх творчасці. Ваганты і сучасная студэнцкая субкультура.

Паняцці «эпоха Рэнесансу», «эпоха Рэфармацыі». Жанры сярэдневяковых прадстаўленняў. Узнікненне містэрыяльнага тэатра. Драматургія містэрыі па трох асноўных частках Біблії. Тэатр дэль артэ. Камедыя масак. Працэсія. Маскарад. Смехавая культура Рэнесансу.

## Раздзел ІІІ. Гісторыя фарміравання беларускай святочнай культуры (дыялог народнай і хрысціянскай традыцый)

### *Тэма 1. Космапланетарныя асновы структуры беларускага народнага календара*

Чатырохтактная мадэль структуры беларускага народнага календара як адлюстраванне прыродна-касмічнай цыклічнасці. Гісторыя фарміравання сістэмы свят і абрадаў народнага календара беларусаў. Семантыка і сімволіка міфа-рытуальных дзеянняў (акцыянальны код), нарматыўна-прававое поле абрадаў (стэрэатыпы паводзін, рэгламентацыі, табуіраванне, абмежаванні, прадпісанні). Атрыбутыўны код рытуальна-абрадавых практык. Яйка і зерне – універсальныя атрыбуты і сімвалы прыродна-касмічнай цыклічнасці. Часавая суаднесенасць галоўных свят традыцыйнага календара. Ушанаванне продкаў на пачатку і завяршэнні цыкла земляробчых работ.

### *Тэма 2. Пантэон вярхоўных багоў як міфалагічная аснова структурнай упарадкаванасці традыцыйнага календара ("каляндарныя" багі)*

Супрацьстаянне Пяруна і Вялеса як касмаганічны саюз Неба і Зямлі ў каляндарнай абраднасці беларусаў: святы Грамніцы і Ўлассе, "Ваджэнне і пахаванне Стралы", Ілля Грамавержац, "градавая серада – сухі чацвер".

Салярная аснова ў фарміраванні структуры календара. Бог Сонца Дажджбог і яго шматаблічнае ўвасабленне ў святах сакральнага календара: Ярыла, Купала. Зімовае і летняе сонцастаянні – святкаванне Калядаў і Купалля. Веснавое і восеньскае раўнадзенства – святкаванне Масленіцы, Вялікадня і Багача.

Святы веснавога адмыкання зямлі і яе нябесныя ахоўнікі: Ярыла – Юр'е; першы удар грому як прадвеснік адкрыцця хтанічнага свету. Восеньскае згортванне земляробчай падзейнасці: вобраз багіні ўрадлівасці Мокашы ў святах жніва; Узвіжанне – замыканне хтанічнага свету; Пакровы – рытуальная мяжа завяршэння земляробчых спраў.

*Тэма 3. Культ продкаў у сістэме каляндарных святкаванняў*

Тэма вяртання продкаў у сімволіцы абрадавых ахвярапрынашэнняў. Сімволіка першага ў абрадах ушанавання продкаў (першая лыжка куцці, абрадавае печыва "чырачкі", велікоднае яйка, першы сноп жыта). Калядная куцця – канцэпт каляндарнага памежжа.

Каляндарныя ўшанаванні продкаў: масленічныя пахаванні "бабы" і "дзеда", Масленічныя Дзяды, аўсяны кісель на Камаедзіцу; Наўскі Вялікдзень – чацвер Велікоднага тыдня, Траецкія Дзяды; палескі абрад "Ваджэнне Куста". Ушанаванне продкаў у земляробчай падзейнасці: Радаўніца – пачатак цыкла земляробчых спраў, Восеньскія Дзяды – завяршэнне сельскагаспадарчых спраў.

Памінальныя дні на працягу года, "радзіцельскія" суботы.

*Тэма 4. Народная дэманалогія ў сістэме каляндарных святкаванняў*

Народныя прыкметы, звязаныя з распачынаннем перыяду стасункаў з прадстаўнікамі хтанічнага свету. Міфапаэтычныя асновы традыцыйных уяўленняў аб русалках. Русальны тыдзень – складаны комплекс ушанавання русалак. Дэманалогія беларускага Купалля. Нарматыўна-прававое поле паводзін у перыяд ад Купалля да Пятра.

Узвіжанне – каляндарная мяжа замыкання хтанічнага свету. Абрадавыя абмежаванні ў сістэме паводзін. Міфапаэтычны комплекс уяўленняў пра Цара вужоў, легенды і паданні пра вы-Рай. Сімволіка абрадавых дзеянняў на Юр'я (выпускае хтанічных істот) і Узвіжання (закрывае хтанічных істот).

*Тэма 5. Традыцыі навалецця ў міфарытуальных практыках беларусаў*

Каляндарная прымеркаванасць пачатку Новага года ў перыяд ад зімовага сонцастаяння да веснавога раўнадзенства. Характарыстыка часу ў міфалагічных вераваннях.

Рытуальна-абрадавы комплекс Калядаў – сімвалічная мяжа паміж старым і новым годам. Міфалагічныя аспекты касмізацыі хаосу. Гурт калядоўшчыкаў – сімвалічнае ўвасабленне пантэону вярхоўных багоў. Ваджэнне "казы" як ушанаванне бога Сонца. Калядныя кастры.

Матывы навалецця ў рытуальна-абрадавым комплексе Масленіцы. Выпяканне бліноў як увасабленне ідэі нараджэння Сонца. Сацыянарматыўныя аспекты масленічных абрадаў. Сацыяльная рэгуляцыя гендэрных аспектаў захавання роду: Абрад "Калодка".

Камаедзіца: абрад "Разбудзіць мядзведзя" як зварот да татэмных першапродкаў аб распачынанні новага цыкла жыцця.

Велікодны рытуальна-абрадавы комплекс у кантэксце традыцый сустрэчы Новага года. Валачобныя песні – сімвалічнае ўвасабленне сакральнага календара беларусаў. Нябесны пантэон у кантэксце гадавога цыкла земляробчага календара. Чырвонае яйка – сімвал згорнутага часу ў абрадах навалецця.

*Тэма 6. Ушанаванне першаэлементаў славянскай касмагоніі ў структуры народнага календара: апазіцыі "Неба – Зямля", "вада – агонь"*

Міфалагічныя ўяўленні аб архетыпе зямлі. Дыхатамія "Неба – Зямля" ў касмаганічных уяўленнях беларусаў. Легенды і паданні аб ўтварэнні зямлі. Сімвалізацыя зямлі ў міфапаэтычнай спадчыне (Маці-сырая зямля, Маці-карміцелька). Сістэма этыкетна-нарматыўных рэгламентацый у дачыненні да зямлі.

Ушанаванне Зямлі ў каляндарных абрадавых практык. Масленічныя катанні з гор, абрады гукання вясны, Саракі; "асвячэнне" і рытуальнае ўключэнне сельскагаспадарчых прыладаў працы ў навалетні цыкл гаспадарання. Комплекс гаспадарчых і земляробчых рэгламентацый і забарон у прасторы святкавання Благавешчання. Комплекс міфалагічных уяўленняў, звязаных з веснавым адмыканнем зямлі на Юр'е. Першы веснавы гром. Імяніны зямлі ў маі. Ушанаванне зямлі ў рытуальна-абрадавым комплексе "Тройца – Зялёныя святкі". Сістэма гаспадарчых забаронаў, перасцярог, прадпісанняў на перыяд з Купалля і да дня ўшанавання Пятра і Паўла. Абрады заканчэння жніва: завіванне барады, падзяка і ахвяра Маці-зямлі.

Шматэтапнае восеньскае замыканне зямлі: аграрна-прадуцыравальныя аспекты свята Багач; міфалагічны комплекс уяўленняў свята Ўзвіжанне; Пакровы: сімвалізм завяршэння цыкла земляробчых работ; Восеньскія Дзяды – заключны этап замыкання зямлі на зімовы спачын.

Апазіцыя "вада – агонь" як процістаянне нябеснага і зямнога пачаткаў у касмаганічных міфах беларусаў. Стыхія вады як ўвасабленне хаосу, жаночага пачатку, асновы для ўтварэння зямлі. Уяўленні беларусаў аб міфалагічным статусе першага дажджу, першага снегу. Нарматыўна-прававое поле кантактаў чалавека са стыхіяй вады ў каляндарным колазвароце: хрышчэнская вада, "купанне ў Іардане", купанне ў чысты чацвер, качанне па расе на Юр'е, забарона купацца на Русальным тыдні, у купальскую ноч, пасля Іллі Грамавержца.

Ушанаванне свяшчэннага агню: Грамнічная свяча як абярэг хатняй гаспадаркі ад перуновых стрэл у час навальніцы. Ушанаванне дрэў, у якія трапіла “перунова страла”. Сімвалізм першага веснавога грому. Святы агонь праваслаўнай Пасхі. Ушанаванне агню ў юраўскай абраднасці. Абрад “Ваджэнне стралы” – захавання вёскі і пасеваў ад засухі і пяруновых стрэл. Беларускае Купалле як сінтэз касмічных стыхій агню і вады. Купальскае вогнішча – сімвал росквіту Сонца.

Культ агню ў памінальнай абраднасці беларусаў. Палесскі абрад “Жаніцьба коміна” як сімвал перанясення агню ў прастору сялянскага жылля.

*Тэма 7. Аброчная традыцыя ў сістэме каляндарных абрадаў беларусаў*

Міфасемантычныя і сацыянарматыўныя аспекты традыцыі абракання. Формы і структура абракальных абрадаў. Зместавыя аспекты абрадаў абракання: захаванне дабрабыту, калізіі сямейнага жыцця, лёс чалавека, удзел у вайне, самагубства каго-небудзь з членаў сям’і. Індывідуальныя, сямейныя, родавыя, агульнавясковыя абракальныя традыцыі; мужчынская і жаночая аброчныя традыцыі. Узаемасувязь традыцыі абракання з днямі ўшанавання хрысціянскіх святых. Рэгіянальныя асаблівасці абракальных абрадаў. Знітаванасць традыцыі абракання з локусамі сакральнай геаграфіі беларусаў: святыя крыніцы, свяшчэнныя дрэвы, камяні-крыжы і камяні-следавікі.

Царкоўны каляндар і сістэма аброчных традыцый: Варвараўская свяча ( “Гулянне ў свячу”); Мікольская братчына і аброчная свечка; абракальная традыцыя на Ўшэсце, сувязь з абрадам “Ваджэнне і пахаванне Стралы (“Вынас свечкі”); Петрапаўлаўская аброчная традыцыя (“Брязгун”); Пакроўская свяча.

*Тэма 8. Беларускі карнавал: маскі і маскаванне, пераапрананне*

Беларускі карнавал у кантэксце еўрапейскіх містэрыяльных традыцый. Прасторава-часавы кантынуум беларускіх карнавалаў: абрадавае мадэляванне будучыні. Антысвет карнавальных відовішчаў. Сімволіка тэатралізаваных відовішчаў. Міфасемантычныя аспекты карнавальных традыцый. Пераапрананне як унікальная з'ява беларускай святочна-абрадавай культуры. Сімволіка-міфалагічная (салярная), магічная (карпаганічная, апатрапеічная), татэмістычная версіі паходжання карнавалаў. Галоўныя персанажы карнавальных відовішчаў: міфічныя багі, антрапаморфныя і зааморфныя постаці. Інверсійныя формы каляндарных відовішчаў: трансфармацыя мужчынскага і жаночага пачаткаў. Пераапрананне як спецыфічны тып гульні. Сімвалізм адзення і рэчаў. Эратычны свет народна-карнавалізаванай культуры.Карнавальныя пераапрананні і

маскаванне. Карнавальныя маскі: тэхналогіі вырабу, працэсуальны кантынуум, рэчыўны свет. Карнавальны свет каляндарных абрадаў.

*Тэма 9. Гульня як абавязковая частка беларускай святочнай культуры*

Тэорыя Хёйзенгі аб станаўленні культуры на аснове гульні. Міфалагічная аснова святочных гульняў беларусаў. Класіфікацыя каляндарных, сямейна-родавых і пазаабрадавых гульняў. Гульні ў кантэксце каляндарных святкаванняў беларусаў. Эратычны аспект гульнёвых традыцый моладзі перадшлюбнага ўзросту. Абрадавыя гульні ў кантэксце вясельных абрадаў. Сацыялізацыя падлеткаў як спецыяльная тэма каляндарных святкаванняў.

Традыцыйныя зімовыя ігрышчы беларусаў: генезіс і тэндэнцыі развіцця зімовага гульнёвага комплексу. Калядныя гульні ў закрытым памяшканні. Тэатралізаваныя калядныя гульні (“Жаніцьба Цярэшкі”, “Яшчар”, “Жаніцьба Бахара”). Калядныя гульні на адчыненай прасторы (“Цягнуць каляду на дуба”, “Кола”, “Конікі”, “Слуп”, перацягванне канатаў).

Абрадавыя і пазаабрадавыя гульні веснавых свят народнага календара. Земляробчы-магічны накіраванасць абрадавых веснавых гульняў (качанне на арэлях, валачэнне калодкі, качанне яек, “біткі”. Антрпаморфныя (баба, дзед) і зааморфныя персанажы абрадавых веснавых гульняў: птушкі, тур. “Тураўскі карагод” – юраўскае ігрышча моладзі. “Ваджэнне і пахаванне Стралы” – сакральна-магічны гульнёвы карагод на перасцярогу вёскі ад Перуна.

Гульнёвыя традыцыі беларускага Купалля. Варожбы на зяляніне, жытніх каласах. Шлюбная накіраванасць тэатралізаваных купальскіх гульняў. Гульнёва-песенныя спаборніцтвы рознаполых груп. Вогненныя ігрышчы (выбар пары, перакідванне вянкоў, варожбы з вянкамі, скокі праз вогнішча, качанне запаленага кола, шуканне папараць-кветкі). Карнавальныя купальскія пераапрананні і начныя абходы вёскі: пераварочванне калёсаў, перанясенне лавак, раскідванне паляніц).

Гульнявыя элементы ў структуры восеньскіх святкаванняў. Карнавалізаваны карагод “Жніўны вянок”. Жніўныя варожбы і вераванні моладзі перадшлюбнага ўзросту падчас свята дажынак. Гульні і варожбы шлюбнай накіраванасці свята Пакровы.

## Раздзел IV. Святочная культура: традыцыі і навацыі

*Тэма 1. Дзяржаўныя святы і цырыманіялы. Прафесійныя святы. Гістарычныя і ваенныя святы*

Дзяржаўнае свята: гістарычнае або грамадска-палітычнае значэнне для краіны, станоўчы ўплыў на развіццё дзяржаўнасці, грамадства, краіны. Спіс дзяржаўных свят Рэспублікі Беларусь. Паняцце «цырыманіял». Шэраг дзеянняў (абрадаў, цырымоній) і прамоў сімвалічнага характару, традыцыйна абавязковых у грамадскім, палітычным жыцці краіны. Параўнальны аналіз цырыманіяльных мерапрыемстваў у дзяржавах свету ў розныя гістарычныя адрэзкі часу.

Прафесійнае свята – сацыякультурная інтэграцыя людзей адной прафесіі або сферы дзейнасці. Каляндар прафесійных свят Рэспублікі Беларусь.

Гістарычныя і ваенныя святы як працэс аднаўлення матэрыяльнай або духоўнай культуры пэўнай гістарычнай эпохі, творчы экскурс у гісторыю.

### *Тэма 2. Міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі, рухі, акцыі*

Гісторыя Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў (Гавана, Масква). Фестываль музыкі ў г. Сопат (Польшча). Гісторыя ўзнікнення міжнароднага музычнага фестываля «Еўрабачанне». Дзіцячы міжнародны музычны фестываль «Еўрабачанне».

Станаўленне міжнародных і рэспубліканскіх фестываляў і конкурсаў ў Рэспубліцы Беларусь.

Новыя фарматы культурнага адпачынку гараджан. «Ноч музеяў» – сусветная акцыя, прымеркаваная да Міжнароднага дня музеяў. Начны агляд музейных экспазіцый. 15 жніўня – дзень бібліятэк у Беларусі. «Бібліяноч» – міжнародная сацыяльна-культурная акцыя, прысвечаная чытанню. Пашырэнне часу і фармату працы бібліятэк, кнігарань, літаратурных музеяў і арт-прасторы.

### *Тэма 3. Мастацка-спартыўныя ідовішчы, спартакіяды. Алімпійскія, Паралімпійскія, Дэльфійскія гульні*

Гісторыя ўзнікнення і развіцця алімпійскага руху. Першыя спартыўныя гульні. Умовы, пераможцы, роля ўзнагарод. Старажытная Грэцыя, г. Спарта. Паняцце "Алімп". Спартакіяда. Алімпіяда. Паралімпіяда – міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы для людзей з інваліднасцю.

Дэльфійскія гульні – спаборніцтвы (конкурсы, фестывалі), выставы і прэзентацыі ў розных галінах мастацтва. Вытокі сучасных Дэльфійскіх гульняў (антычных Піфійскія гульні, старажытнагрэчаскі г. Дэльфы).

Традыцыйныя цырымоніі адкрыцця і закрыцця мастацка-спартыўных відовішчаў.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі | | | |
| **Уводзіны.** Свята як частка культуры | 2 | | | | |
| **Раздзел I. Гісторыя фарміравання беларускай святочнай культуры: палілог каляндарных сістэм** | | | | | |
| *Тэма 1.* Каляндар як складовая частка культуры. Месяцовы і сонечны календары. Параўнальны аналіз сусветных старажытных календароў | 2 | | | | |
| *Тэма 2.* Шляхі фарміравання юліянскай сістэмы летазлічэння як прататыпа сучаснага календара | 2 | | | | |
| *Тэма 3.* Светапоглядныя асновы хрысціянства. Прынцыпы структуравання хрысціянскага календара. Свята Пасхі. Пасхалія. Суаднесенасць веснавых свят беларускага традыцыйнага календара з пасхальным цыклам | 2 | 2 | | 1 | абарона рэфератаў |
| *Тэма 4.* Дыялог культур: суіснаванне народна-ведыйскага і хрысціянскага календароў у гістарычным кантэксце. Грыгарыянская рэформа календара | 2 | 2 | | 1 | абарона рэфератаў |
| **Раздзел II. Традыцыйныя рытуалы і святы ў сусветных культурах** | | | | | |
| *Тэма 1.* Культы і святкаванні старажытных цывілізацый. | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 2.* Гісторыя асноўных традыцыйных свят усходніх краін (Кітай, Японія) | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 3.* Святочная культура Сярэдневякоўя, эпох Рэнесансу і Рэфармацыі | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Раздзел III. Гісторыя фарміравання беларускай святочнай культуры (дыялог народнай і хрысціянскай традыцый)** | | | | | |
| *Тэма 1.* Космапланетарныя асновы структуры беларускага народнага календара | 2 | 2 | | 1 | абарона рэфератаў |
| *Тэма 2.* Пантэон вярхоўных багоў як міфалагічная аснова структурнай упарадкаванасці традыцыйнага календара (“каляндарныя” багі) | 2 | 2 | | | |
| *Тэма 3.* Культ продкаў у сістэме каляндарных святкаванняў | 2 | 2 | | 1 | абарона рэфератаў |
| *Тэма 4.* Народная дэманалогія ў сістэме каляндарных святкаванняў | 2 | 2 | | | |
| *Тема 5.* Традыцыі навалецця ў міфарытуальных практыках беларусаў | 2 | | | 1 | абарона рэфератаў |
| *Тема 6.* Ушанаванне першаэлементаў славянскай касмагоніі ў структуры народнага календара: апазіцыі “Неба – Зямля”, “вада – агонь” | 2 | | | | |
| *Тэма 7.* Аброчная традыцыя ў сістэме каляндарных абрадаў беларусаў | 2 | | | | |
| *Тэма 8.* Беларускі карнавал: маскі і маскаванне, пераапрананне | 2 | | | 1 | абарона рэфератаў |
| *Тэма 9.* Гульня як абавязковая частка беларускай святочнай культуры | 2 | 2 | | 2 | абарона гульнёвай праграмы |
| **Раздзел IV. Святочная культура: традыцыі і навацыі** | | | | | |
| *Тэма 1.* Дзяржаўныя святы і цырыманіялы. Прафесійныя святы. Гістарычныя і ваенныя святы | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 2.* Міжнародныя і рэспубліканскія фестывалі, рухі, акцыі | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| *Тэма 3.* Мастацка-спартыўныя відовішчы, спартакіяды. Алімпійскія, Паралімпійскія, Дэльфійскія гульні | 2 | | | 1 | абарона прэзентацыі |
| **Усяго…** | **40** | **14** | | **14** | |

## Арганізацыя самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне "Гісторыя свят"

Падрыхтоўка творчай работы (прэзентацыі) і падрыхтоўка гульнявой праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя свят», іх абарона спрыяюць выкарыстанню атрыманых ведаў у практычнай дзейнасці. У творчай рабоце неабходна выкарыстоўваць дакладныя веды аб традыцыях святкаванняў у адпаведную культурную эпоху, стварыць мультымедыйную прэзентацыю па выбранай тэме. Абарона творчай работы (або прэзентацыя) павінна ўключаць фота-відэаматэрыялы, тэатралізацыю, акцёрскую манеру выкладання.

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*

*Котляров,* М. Г. Народные праздники : практикум [Электронный ресурс]: [16+] / М. Г. Котляров ; Кемеровский государственный институт культуры, Факультет музыкального искусства, Кафедра народного хорового пения. – Кемерово : Кемеровский государственный институт культуры (КемГИК), 2018. – 59 с. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=613067.

*Котович,* О. В. Сакральный мир традиции. 99 уроков народной культуры : науч. изд. / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2018. – 578 с.

*Махлина,* С.Т. Художественная культура Востока. Повседневность и праздники : учеб. пособие для вузов / С. Т. Махлина. – Москва : Юрайт, 2020. – 194, [1] с. : рис. ; 25x16 см. – (Высшее образование).

*Монина,* Н. П. История и теория праздничной культуры [Электронный ресурс]: учеб. пособие : в 6 частях [16+] / Н. П. Монина ; Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского. – Омск : Омский государственный университет им. Ф.М. Достоевского (ОмГУ), 2019. – Часть 6. История праздничной культуры России Нового и Новейшего времени. – 220 с. – Режим доступа: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=575856.

*Дадатковая*

*Агапкина,* Т. А. Мифопоэтические основы славянского народного календаря. Весенне-летний цикл / Т. А. Агапкина. – М. : Индрик, 2002. – 816 с.

*Байбурин, А. К.* Ритуал в традиционной культуре / А. К. Байбурин. – СПб. : Наука, 1993. – 240 с.

Беларусы : у 12 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука. – Т. 6 : Грамадскія традыцыіі / В. Ф. Бацяеў [і інш.]. – 2002. – 606 с.

*Барышаў, Г. І.* Батлейка / Г. І. Барышаў / М-ва культуры Рэсп. Беларусь ; Беларускі ўніверсітэт культуры. – Мінск, 2000. – 270 с.

*Бахтин, М. М.* Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренессанса / М. М. Бахтин. – М. : Худож. лит., 1990. – 543 с.

Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўнік / рэдкал.: С. Санько (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск : Беларусь, 2006. – 599 с.

*Брабич, В. М.* Зрелища Древнего мира / В. М. Брабич, Г. С. Плетнева. – Л. : Искусство, 1971. – 78 с.

Беларускі народны каляндар / аўт.-уклад. А. Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 1992. – 205 с.

Гульні, забавы, ігрышчы / рэдкал.: А.С.Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1996. – 534 с.

*Гусев, В.Е.* Народные игры, драмы и театр / В.Е. Гусев // Этнография восточных славян. Очерки традиционной культуры. – М.: Наука, 1987. – 458 с.

*Гуд, П. А.* Ад Каляд да Пакроваў / П. А. Гуд ; рэд.-склад. Л. І. Жук. – Мінск : Красіка-Прынт, 2000. – 223 с. – (Беларусь святочная).

*Гуд, П. А.* Беларускі купальскі комплекс і семантыка абрадавых дзей / П. А. Гуд. – Мінск : Тэхнапрынт, 1999. – 221 с.

*Гуд, П. А.* Беларускі кірмаш / П. А. Гуд, Н. І. Гуд. – Мінск : Полымя, 1996. – 268 с.

*Гуд, П. А.* Мастацтва феерверкаў: вогненна-светлавыя дзеі народаў свету / П. А. Гуд. – Мінск : Мэджик Бук, 2007. – 99 с.

*Гутько, О. В.* История праздников : учеб. пособие / О. В. Гутько. – Челябинск, 2013. – 189 с.

*Даркевич, В. П.* Народная культура средневековья. Светская праздничная жизнь в искусстве IX–XVI вв. / В. П. Даркевич ; отв. ред. Г. К. Вагнер. – М. : Наука, 1988. – 344 с.

Жыцця адвечны лад. Беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіча. – Мінск : Мастац. літ., 1998. – Кн. 2. – 607 с.

Земляробчы каляндар: абрады і звычаі / Акад. навук БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; [рэд. кал.: В. К. Бандарчык, К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік (гал. рэд.) ; уклад., класіфікацыя, сіст. матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; уступ. арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 405 с.

Зямля стаіць пасярод свету… / уклад., прадм., пераклад, бібл. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 591 с. – (Беларускія народныя прыкметы і павер'і ; кн. 1.)

Зямная дарога ў вырай/ уклад., прадм., пер. У. Васілевіча. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 654 с. – (Беларускія народныя прыкметы і павер'і ; кн. 3.)

Ивлева, Л. М. Ряженье в русской традиционной культуре / Л. М. Ивлева. – СПб. : Рос. ин-т истории искусств, 1994. – 235 с.

*Калачова, І. І.* Народныя традыцыі і звычаі выхавання: этнапедагагічная спадчына этнасаў Беларусі / І.І.Калачова. – Мінск: Беларусь, 1999. – 179 с.

Календарный вопрос : сб. ст. / ред.-сост. А. Чхартишвили. – М. : Изд-во Сретен. монастыря, 2000. – 345 с.

Каляндарна-абрадавая паэзія / А. С. Ліс, А. І. Гурскі, В. М. Шарая, У. М. Сівіцкі ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; навук. рэд.А. С. Фядосік. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 515 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 1. – 359 с.

*Катовіч, А.* Веснавыя святы : навук.-папуляр. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Мастац. літ., 2005. – Кн. 2. – 413 с.

*Катовіч, А.* Зімовыя святы : навук.-папуляр. выд. / А. Катовіч, Я. Крук. – Мінск : Мастац. літ., 2004. – 119 с.

*Катовіч, А.* Летнія святы : навук. выд. : у 2 кн. / А. Катовіч, Я. Крук.– Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. – Кн. 1. – 368 с.

*Катовіч,* А. В. Мікольская "Свяча" – феномен абрадавай практыкі беларусаў (в. Чарапы Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці) / Аксана Катовіч, Янка Крук. – Мінск : Інбелкульт, 2013. – 93 с.

*Климишин, И. А.* Календарь и хронология / И. А. Климишин. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Наука, 1985. – 320 с.

*Конович, А. А.* Театрализованные праздники и обряды в СССР / А. А. Конович. – М. : Высш. шк., 1990. – 206 с.

*Котович, О. В.* Белорусская свадьба в пространстве традиционной культуры / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2012. – 848 с.

*Криничная,* Н. А. Русская мифология: мир образов фольклора /Н. А. Криничная. – М. : Академ. Проект : Гаудеамус, 2004. – 1006 с.

*Крук,* І. І. Следам за сонцам: Бел.нар.каляндар: Дапаможнік для педагогаў дзіцячых дашк. устаноў / І.І. Крук. – Мінск : Ураджай, 1998. – 216 с.

*Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры : навук. выд. / Я. Крук. – Мінск : Беларусь, 2011. – 430 с.

*Кухаронак,* Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск: Ураджай, 2001. – 239 с.

*Лозка,* А. Беларуская батлейка. Каляндарныя і абрадавыя гульні / А.Лозка. – Мінск: Тэхналогія, 1997. – 183 с.

Легенды і паданні / [склад.: М. Я. Грынблат, А. І. Гурскі ; рэдкал.: В. К. Бандарчык і інш.; рэд. тома А. С. Фядосік ; уступ. арт. М. Я. Грынблата]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.

Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад.: І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. : Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.

Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – М. : Советская Энциклопедия, 1987. – Т.1 : А-К. – 671 с.

Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – М. : Советская Энциклопедия, 1988. – Т. 2 : К-Я. – 719 с.

Народны тэатр / уклад. М.А. Каладзінскі. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 554с.

*Ненадавец,* А. М. За смугою міфа / А. М. Ненадавец. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 254 с.

*Ненадавец,* А. М. Міфалогія роднага краю / А. М. Ненадавец. – Мінск : Беларусь, 2018. – 399 с.

*Ненадавец,* А. М. Нарысы беларускай міфалогіі / А. М.Ненадавец. – Мінск: Беларус. навука, 2013. – 535 с.

*Ненадавец,* А. М. Сілаю слова. Чорная і белая магія / А.М. Ненадавец. – Мінск : Беларусь, 2002. – 350 с.

*Новак,* В. С. Міфалогія беларусаў / В. С. Новак. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2005. – 252 с.

*Орлов, О. Л.* Теоретические аспекты изучения праздничной культуры России / О. Л. Орлов. – СПб. : СПбГУКИ, 2001.

*Пави, П.* Словарь театра / П. Пави. – М. : ГИТИС, 2003. – 504 с.

*Рябков, В. М.* Антология форм праздничной и развлекательной культуры России (первая половина XX в.) : учеб. пособие / В. М. Рябков ; Челяб. гос. акад. культуры и искусств. – Челябинск : Полиграф-Мастер, 2007. – Т. 4. – 870 с.

*Сапронов,* П. А. Первобытный ритуал / П. А. Сапронов // Культурология : курс лекций по теории и истории культуры / П. А. Сапронов. – 2-е изд., доп. – СПб. : Лениздат : Союз, 2001. – С.103–114.

*Сержпутоўскі,* А. К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 302 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2001–2010. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе, 2001. – 797 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т. Б. Варфаламеева, А. М. Боганева, М. А. Козенка [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2001 –2010. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне, 2004. – 910 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2006. – 608 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 3: Гродзенскае Панямонне. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2006. – 736 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 4: Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2009. – 863 с.

Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеева. – Т. 5: Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1 / В. И. Басько [і інш.]. – Мінск: Выш. шк., 2010. – 847 с.

*Шамак,* А. А. Міфалогія Старажытнай Беларусі / А. А. Шамак, – Мінск : Сэр-Віт, 2004. – 240 с.

*Шамякіна,* Т. І. Міфалогія Беларусі: нарысы: вучэб. дапаможнік / Т. І. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 399 с.

*Шамякіна,* Т. І. Славянская міфалогія : курс лекцый / Т.І. Шамякіна. – Мінск : РІВШ, 2005. – 155 с.

*Шапарова,* Н. С. Краткая энциклопедия славянской мифологии: ок. 1000 ст. / Н. С. Шапарова. – М. : АСТ и др., 2001. – 623 с.

*Шарая, О.Н.* Ценностно-нормативная природа почитания предков / О.Н.Шарая. – Минск:Технология, 2002. – 249 с.

*Шубина, И. Б.* Драматургия и режиссура зрелища: Игра, сопровождающая жизнь : учеб.-метод. пособие / И. Б. Шубина. – Ростов н/Д : Феникс, 2006. – 288 с.

*Черняк, Ю. М.* Режиссура праздников и зрелищ : учеб. пособие для студентов / Ю. М. Черняк. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 223 с.

*Цітоў, А. К.* Гарадская геральдыка Беларусі / А. К. Цітоў. – Мінск : Полымя, 1989. – 207 с.